ЯКУЮ НЕБЯСПЕКУ ТОІЦЬ ТЭФЛОН? 11





АКЦЭНТЫ ЮБІЛЕЙНАГА «ЛІСТАПАДА» 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЛІСТАПАДА 2024 г. СУБОТА № 215 (30349)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАРТУН, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«Патэнцыял росту цяпер знаходзіцца ў рэгіёнах, у тым ліку гарадах-спадарожніках Мінска. Напрыклад, у Смалявічах наладжана вельмі добрая інфраструктура. Гэта тое, пра што гаворыць Прэзідэнт. У найбліжэйшую пяцігодку мы будзем настройваць работу ў бок стварэння ўмоў у рэгіёнах, каб людзі заставаліся там, працавалі, атрымлівалі дастойную заробатную плату. У Мінску жыць будзе даражэй. Усе будуць супастаўляць і лічыць. Так, у Мінску, можа быць, зарплата большая, але і жыццё даражэйшае. Дык лепш, можа, недзе ў Смалявічах ці ў Жодзіне жыць, у цудоўных гарадах Мінскай ці нейкай іншай вобласці, маючы пры гэтым стабільную работу, і раз на месяц прыязджаць з радасцю пагуляць па сталіцы».*

# Месца работы — неба



Заўтра сваё прафесійнае свята адзначаць усе, хто мае дачыненне да грамадзянскай авіяцыі. Будзе шмат зычэнняў і цёплых слоў. Бо, як адзначана ў віншаванні кіраўніка дзяржавы, «дзякуючы стабільнай якасці і надзейнасці аказваных паслуг, пашырэнню маршрутнай сеткі і нязменнай пунктуальнасці, беларускія авіятранспартныя прадпрыемствы заваявалі аўтарытэт ва ўсім свеце. У гэтым заслуга ўсіх прафесіяналаў беларускай грамадзянскай авіяцыі».

Бортправаднік 7-й групы кабінных экіпажаў Ганна ФРОЛІКАВА (*на фота*) у кампаніі «Белавія» ўжо больш як дзесяць гадоў. За гэты час яна працавала ў складзе экіпажа на ўсіх тыпах самалётаў, якія эксплуатуюцца авіякампаніяй, атрымала кваліфікацыю «інструктар-экзаменатар». Ганна прызнаецца, што не ўяўляе свайго жыцця без неба, якое стала яе працоўным месцам.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

• **11 лістапада 2024 года Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь І. П. Сергяенка правядзе асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Палаце прадстаўнікоў.**

**Папярэдні запіс на асабісты прыём будзе ажыццяўляцца 4 і 5 лістапада з 8.00 да 17.00 (перапынак 13.00—14.00) па тэлефоне (017) 222 69 25.**

• З пачатку года ў Беларусь заехалі 114 784 грамадзяніны Украіны.

• **Валавая здабыча нафты ў краіне дэманструе ўстойлівую дынаміку росту.**

• Паводле апошніх звестак, аграрыі краіны сабралі 149,9 тыс. т агароднін пры ўраджайнасці (без агароднінага гарошку) 362,4 ц/га.

ISSN 1990 — 763X

Падрабязнасці

## Што будуюць, а што ўжо ўвялі ў эксплуатацыю?

### Як, калі і дзе сталіца і цэнтральны рэгіён узводзяць аб'екты сацыяльнай інфраструктуры

**Штогод у беларускай сталіцы і Мінскай вобласці будуецца і рэканструюецца вялікая колькасць аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Гэта ўстановы адукацыі, аховы здароўя, культуры, а таксама спартыўна-аздараўленчыя і іншыя збудаванні. Такія аб'екты ўзводзяцца ў тых месцах, дзе ёсць неабходнасць. Карэспандэнт «Звязды» высветліў падрабязнасці будаўніцтва названых аб'ектаў.**

СТАР. 3



Фота БелТА.

Транспарт

## «НА КРЫЛАХ» — КАЛЯ 2 МІЛЬЁНАЎ ПАСАЖЫРАЎ




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Пра тое, як развіваецца авіяцыйная галіна, паведаміў дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь Ігар ГОЛУБ.**

СТАР. 4

# ТРЭБА ЗАХАВАЦЬ СТАБІЛЬНАСЦЬ



Фота БелТА.

**Вынікі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у Магілёўскай вобласці былі падведзены на выязным пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ у Кіраўску. Пасяджэнне адбылося на базе ААТ «Рассвет імя К. П. Арлоўскага». Удзел у ім прынялі сенатары, прадстаўнікі выканаўчай і прадстаўнічай улады, Маладзёжнага парламента, грамадскіх арганізацый.**

— Работа са зваротамі грамадзян прыярытэтная ў нашай дзейнасці, — падкрэсліла Наталля Качанава на пачатку сустрэчы. — Гэту форму мы выкарыстоўваем пастаянна, таму што законы, як кажа наш Прэзідэнт, павінны ісці ад зямлі.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што ў краіне выразна выбудавана работа са зваротамі грамадзян. І эфект вялікі. Але жыццё ідзе і ўзнікаюць новыя пытанні. І ўсе іх трэба вельмі ўважліва разбіраць.

— Людзі на прыём прыходзяць розныя, — аргументавала Наталля Качанава. — Да ўсіх трэба ставіцца з павагай і цярпеннем. Выслухаць і ўзяць на заметку. З пытанняў, якія да нас паступаюць, фарміруюцца ў тым ліку і прапановы па змяненні ў законы. Калі ёсць новыя выклікі ці праблемы, гэта трэба рабіць.

Вельмі эфектыўная форма, якую практыкуе Савет Рэспублікі, — гэта правядзенне адзінага дня прыёму грамадзян у рэгіёнах. Нядаўна такі адбыўся ў Магілёўскай вобласці. Савет Рэспублікі азнаёміў прысутных з вынікамі такой работы за апошнія два гады. Як адзначыў у сваім дакладзе **загадчык аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і ўнутраным кантролі Сакратарыята Савета Рэспублікі Максім ШЭКО,** колькасць зваротаў да сенатараў зніжаецца, але назіраецца рост паўторных і калектыўных. На першым месцы пытанні ЖКГ, землекарыстання, землеўпарадкавання.

**Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Мікалай ДЗЯДКОЎ** дэталёва расказаў, якая праводзіцца работа з насельніцтвам у рэгіёне. Яна досыць эфектыўная. Па выніках разгляду зваротаў у 2022—2023 гадах, станоўча вырашаны шэраг значных для жыхароў вобласці пытанняў у сферы жыллёва-камунальнага будаўніцтва і інжынерна-транспартнай структуры, прыняты меры па паляпшэнні якасці пасажырскіх перавозак, даступнасці аказання медыцынскай дапамогі. Сёння ў прыярытэце тая ж тэматыка — жыллёва-камунальная гаспадарка, архітэктура і будаўніцтва, жылы фонд, землеўпарадкаванне і землекарыстанне, гандаль і спажывецкі рынак, транспарт, праца, занятасць насельніцтва, ахова працы, сацыяльнае і пенсіённае забеспячэнне.

Вопытам работы з насельніцтвам падзяліліся прадстаўнікі райсавета, сельсаветаў. Наталля Качанава ўхваліла форму работы Крычаўскага райсавета з органамі тэрытарыяльнага грамадскага савета — актыўнымі прадстаўнікамі насельніцтва. Яна лічыць, што гэты вопыт павінен быць распаўсюджаны і на іншыя рэгіёны. Бо такая форма працуе на папярэджанне скаргаў і стварэнне згоды ў грамадстве.

— Мы павінны захаваць мір і стабільнасць у краіне, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — У дзяржаве шмат чаго робіцца для таго, каб жыццё было камфортным і спакойным. Прэзідэнтам пастаўлена задача адкрываць прадпрыемствы, развіваць эканоміку. Сёлета наша эканоміка вельмі добра спрацавала. Гэта відаць па тым, як працуюць сацыяльныя праграмы. Двойчы павышаліся пенсіі, падоўжаны тэрмін дзеяння сямейнага капіталу, пашыраны магчымасці яго прымянення. Укладаюцца вялікія сродкі ў будаўніцтва дарог, жылля. Пра гэта таксама павінна ведаць насельніцтва. Бо ўсё, што робіцца, накіравана выключна на росквіт нашай краіны і рост дабрабыту людзей. Пра гэта вельмі важна помніць у такі неспакойны час, калі вакол Беларусі ідзе нагнятанне абстаноўкі, вядуцца спробы ўмяшання ў нашы ўнутраныя справы. Трэба ўсяму гэтаму супрацьстаяць.

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Рассвет імя К. П. Арлоўскага» Аляксандр БАГЕЛЬ** падкрэслівае, што работа з насельніцтвам дапамагае адчуваць настрой грамадства.

— Трэба быць уважлівым да прапаноў людзей, калектываў, без гэтага нельга, — заўважае ён. — Розныя пытанні паступаюць: зямельныя спрэчкі, непаразуменне з суседзямі, дрэнныя дарогі. Яны вырашаюцца, магчыма, дзесьці на іх не паспелі прарэагаваць. Шмат пытанняў вырашаецца ў працэсе. Калі людзі пачынаюць запісвацца на прыём да сенатара, выканкамы імкнуцца зняць праблему яшчэ да прыёму. Гэта нядрэнна, бо людзі задаволены.

Пасля пасяджэння Наталля Качанава наведала мемарыяльны комплекс у вёсцы Боркі, дзе прыняла ўдзел у цырымоніі ўскладання кветак да памятнага знака «Памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці». А затым наведала палацава-паркавы ансамбль Булгакаў у аграгарадку Жылічы, які быў адноўлены па інвестпраграме «Культура Беларусі».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*Кіраўск.*

***Аб чым яшчэ ішла размова на выязным прэзідыуме Савета Рэспублікі ў Кіраўску, чытайце ў найбліжэйшым выпуску «Мясцовага самакіравання».***

# ГАРАНТ КЛОПАТУ І ШЧАСЦЯ

## Ігар СЕРГЯЕНКА адкрыў у Паставах новы дзіцячы дом сямейнага тыпу

**У горадзе Паставы Віцебскай вобласці адкрылі новы дзіцячы дом сямейнага тыпу, які стаў другім такім аб'ектам у раёне. Урачыстае адкрыццё сімвалічна адбылося напярэдадні 7 лістапада, калі дзяржава ўжо па добрай традыцыі робіць людзям падарункі ў выглядзе новых сацыяльных аб'ектаў. Чырвоную стужку на парозе новага дома дзеці перарэзалі разам са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігарам Сергяенкам.**



Неабходнасць будаўніцтва другога дзіцячага дома сямейнага тыпу на Пастаўшчыне ўзнікла ў пачатку 2023 года і абумоўлена недастатковай колькасцю і перапоўненасцю прыёмных сем'яў, немагчымасцю забяспечыць сумеснае пражыванне братоў і сясцёр са шматдзетных сем'яў, якія засталіся без апекі бацькоў. Новы аб'ект разлічаны на пражыванне 10 дзяцей, у тым ліку з абмежаванымі магчымасцямі.

На адкрыцці дзіцячага дома сямейнага тыпу Ігар Сергяенка заўважыў, што яшчэ ў 1998 годзе пачала рэалізоўвацца прэзідэнцкая праграма «Дзеці Беларусі». І новы аб'ект у Паставах — гэта яшчэ адна цаглінка ў рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне. Такі дом — ужо другі ў Паставах і адначасова 275-ы ў Беларусі. Гэта сведчыць аб вялікай увазе, што сёння ўдзяляецца выхаванню дзяцей, якія апынуліся ў складанай сітуацыі.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў: заканадаўчая база выразна прапісана ў Кодэксе аб сям'і і шлюбе, у прыватнасці, хто можа быць бацькамі-выхавацелямі. Разам з тым сёння ў Палаце прадстаўнікоў разглядаюцца змяненні ў Кодэксе аб адукацыі. Адна з прапаноў, якая паступіла, — аднесці бацькоўвыхавацеляў да педагагічных работнікаў, паколькі яны займаюцца выхаваннем дзяцей, маюць адпаведную падрыхтоўку, самаадукацыю.

З віншаваннямі да навасёлаў звярнуўся і **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ.** «З боку дзяржавы аказваецца ўсялякая падтрымка, каб такія сем'і, як ваша, ні ў чым не мелі патрэбу і дзеці былі па-сапраўднаму шчаслівыя, атулены клопатам і любоўю і адчувалі бацькоўскія плячо і ласку», — сказаў кіраўнік дэпутацкага корпуса Віцебшчыны.

Бацькамі для тых, каму патрэбна падтрымка і любоў, стала сям'я Пупкевічаў, якія ўжо выхавалі траіх сваіх і дваіх прыёмных дзяцей. А калі апошнія былі гатовыя да самастойнага жыцця, прынялі ў сям'ю яшчэ семярых — дзетак асаблівых, з сур'ёзнымі праблемамі са здароўем. Размаўляючы з Луцыяй і Валерыем Пупкевічамі, Ігар Сергяенка адзначыў, што трэба мець вялікае сэрца і любіць дзяцей, каб узваліць на сябе такі груз адказнасці, і гэта заслугоўвае самай высокай ацэнкі і павагі.

Многія з пастаўчан уразіліся ўчынкам сям'і. Называюць гэта бацькоўскім подзвігам, калі кожны дзень трэба змагацца за жыццё падапечных, вучыць самым простым навыкам, цяплом і клопатам разганяць іх страх перад навакольным светам. Таму ўдзячных слоў і пажаданняў у гэты дзень Валерый і Луцыя пачулі шмат, а самі не пераставалі дзякаваць усім, хто падарыў сям'і новы дом.

***

У гэты дзень у рамках рабочага візіту ў Пастаўскі раён Ігар Сергяенка наведаў Пастаўскі льнозавод і правёў сустрэчу з працоўным калектывам. У мінулым годзе на прадпрыемстве завяршылася мадэрнізацыя, якая працягвалася 12 гадоў. Па словах дырэктара Алены Юрынёнак, год таму з дзяржаўнай падтрымкай устанавілі новае абсталяванне, што паспрыяла паляпшэнню фінансава-эканамічных паказчыкаў і павышэнню зарплаты работнікаў. Завод сам нарыхтоўвае сыравіну, якую потым самастойна перапрацоўвае. У гэтай галіне сёлета таксама высокія паказчыкі: прадпрыемства сабрала рэкордны ўраджай аб'ёмам 6200 тон. У перспектыве — асваенне вытворчасці сумесавых нітак. «Дзяржава сёння падтрымлівае прадпрыемствы, якія займаюцца перапрацоўкай такой культуры, як лён. Асноўная затратная частка пры вырошчванні лёну — набыццё ўгнаенняў і дызельнага паліва. І тое, і другое фінансуецца дзяржавай. Пры здачы валакна нам таксама ідзе кампенсацыя ў залежнасці ад нумара», — адзначыла дырэктар ААТ «Пастаўскі льнозавод».

«Немалаважна, што амаль тры гады тут працуе новы кіраўнік — энергічная жанчына, якая здолела аб'яднаць калектыў і настроіць на працу. Вытворчыя паказчыкі пайшлі ў лепшы бок, як і заработная плата. Адсюль і настрой людзей. Сёння гэтаму прадпрыемству патрэбна дапамога дзяржавы, але неабходна працаваць над тым, каб павышаць якасць той прадукцыі, якую мы выпускаем», — падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў у размове з журналістамі.

Падчас сустрэчы таксама ішла размова аб рабоце парламента нашай краіны, эканамічнай і сацыяльнай палітыцы дзяржавы, забеспячэнні міру і будучых выбарах Прэзідэнта.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**

Міжнародны вектар

# Перспектыўны афрыканскі напрамак

**4—5 лістапада дэлегацыя Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на чале з Ігарам Сергяенкам па запрашэнні Старшыні Панафрыканскага парламента Форчуна Чарумбіры наведае горад Мідранд (ПАР) для ўдзелу ў чацвёртым пленарным пасяджэнні Панафрыканскага парламента шостага склікання.**

Беларускаму парламенту ўпершыню ў гісторыі дадзена магчымасць выступіць на афіцыйнай цырымоніі адкрыцця сесіі Панафрыканскага парламента, якая адбудзецца 4 лістапада 2024 года, падкрэслілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў.

Плануецца таксама падпісанне Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Панафрыканскім парламентам, у адпаведнасці з якім парламенту Беларусі будзе дадзены статус наглядальніка пры гэтай міжпарламенцкай арганізацыі.

Яшчэ ў праграме візіту запланаваны сустрэчы Старшыні Палаты прадстаўнікоў Ігара Сергяенкі з кіраўніцтвам Панафрыканскага парламента, Нацыянальнай асамблеі ПАР, кіраўнікамі парламенцкіх дэлегацый краін Афрыкі.

Прэзідэнт Беларусі абазначыў Афрыку адным з галоўных арыенціраў у знешняй палітыцы і адным з прыярытэтных знешнеэканамічных вектараў нашай краіны. Цяпер стаяць задачы ўсебаковага развіцця гандлёва-эканамічных адносін з краінамі Афрыкі і забеспячэння росту экспарту беларускіх тавараў і паслуг на афрыканскі рынак.

Панафрыканскі парламент адыгрывае важную ролю ў афрыканскім палітычным жыцці, ён з'яўляецца органам Афрыканскага саюза. У ПАП уваходзяць 275 парламентарыяў, якія прадстаўляюць 55 дзяржаў — членаў Афрыканскага саюза. У чэрвені 2022 года Старшынёй быў выбраны сенатар Парламента Зімбабвэ Форчун Чарумбіра.

# Што будуюць, а што ўжо ўвялі ў эксплуатацыю?



## АБ'ЕКТЫ ЦЭНТРАЛЬНАГА РЭГІЁНА




«Сёлета інвестыцыйная праграма будаўніцтва ў Мінскай вобласці даволі вялікая. Аб'ём сродкаў, які закладзены ў яе, перавышае 200 мільёнаў рублёў, — распавёў **першы намеснік старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінскага аблвыканкама Аляксей БЫКАЎ.** — Сярод аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры сёлета ўведзены будынак паліклінікі цэнтральнай раённай бальніцы ў Нясвіжы, на стадыі ўводу знаходзіцца і сучасная паліклініка ў Смалявічах. У наступным годзе будуць працягнуты будаўнічыя работы комплексу бальніцы і паліклінікі ў Заслаўі, станцыі пералівання крыві ў Барысаве. Таксама працягваецца будаўніцтва лячэбнага корпуса ў пасёлку Дружны і вялікага хірургічнага корпуса № 2 Мінскай абласной клінічнай бальніцы».

Вялікая ўвага — і будаўніцтву аб'ектаў фізічнай культуры і спорту. «Сёлета ўжо здалі два аб'екты. Гэта прыбудова будынка басейна з пешаходнай галерэяй у Мядзеле і фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Дзяржынску. Сёння працягваецца будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчых комплексаў у Крупках і ў вёсцы Лескаўка Мінскага раёна», — адзначыў першы намеснік старшыні.

Аляксей Быкаў расказаў і аб будаўніцтве ўстаноў адукацыі: «Узводзяцца дзіцячыя садкі ў Смілавічах і Лагойску. Плануецца таксама будаўніцтва двух дзіцячых садоў у Мінскім раёне: у Прылуках і Сеніцы. Акрамя таго, сёння ўзводзіцца пачатковая школа — дзіцячы сад у Слуцку, а яшчэ школа на 1020 месцаў у Фаніпалі. Завяршылі і ўвялі ў эксплуатацыю сярэднюю школу на 930 месцаў у Салігорску. Яна будавалася ў рамках праекта з буйнапанэльнага домабудавання, які мы будзем у далейшым прымяняць пры будаўніцтве школ на тэрыторыі Мінскай вобласці. Гэты праект выгадны па тэрмінах будаўніцтва і магчымасцях кампаноўкі пад канкрэтныя ўмовы, неабходныя ўстанове адукацыі. Таксама пачата будаўніцтва школы ў Жодзіне, праектуюцца аб'екты ў прысталічных Прылуках».

У Мінскай вобласці ўзводзяцца і аб'екты сацыяльнай абароны. Як адзначыў Аляксей Быкаў, у наступным годзе плануецца завяршэнне будаўніцтва сацыяльнага цэнтра ў Стоўбцах: «Таксама працягваецца ўзвядзенне будынка тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ў вёсцы Бараўляны. Яго ўвод у эксплуатацыю плануецца да канца гэтага або на пачатак наступнага года. У 2025 годзе пачнецца будаўніцтва тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ў Смалявічах».

На гэтых аб'ектах Міншчына не спыняецца. Ужо складзены перспектыўныя планы на 2025 год. «Заўважу, што аб'ём інвестыцыйных сродкаў, якія ўкладаюцца ў будаўніцтва, у наступным годзе не паменшыцца, адпаведна, тэмпы работ па ўзвядзенні сацыяльных аб'ектаў будзе захаваны», — падсумаваў Аляксей Быкаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## А ШТО З'ЯВІЦЦА Ў СТАЛІЦЫ?

На будаўніцтва аб'ектаў сацыяльнага прызначэння Мінск выдзяляе немалыя сродкі. Сёлета на ўзвядзенне аб'ектаў аховы здароўя, адукацыі, культуры, фізічнай культуры і сацыяльнай абароны будзе выдаткавана каля 460 мільёнаў рублёў. Пра гэта распавяла **загадчык сектара капітальных укладанняў камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінскага гарвыканкама Наталля ГАЎРЫЛАВА.**

«Сёлета былі ўведзены ў эксплуатацыю дзіцячы садок у межах вуліц Скрыпнікава — Адзінцова, школа ў мікрараёне Лябяжы. Завершана будаўніцтва найстарэйшага сталічнага кінатэатра «Перамога», увялі ў эксплуатацыю псіханеўралагічны інтэрнат «Расток» для дзяцей з асаблівасцямі развіцця, пажарнае дэпо ў жылым комплексе «Мінск-Свет». Да канца года плануецца завяршыць узвядзенне інтэрната для студэнтаў БНТУ, рэканструкцыю стадыёна «Трактар» і будаўніцтва дзіцячага садка ў Бараўлянах», — адзначыла Наталля Гаўрылава.

Па яе словах, у наступным годзе плануецца ўвод у эксплуатацыю адразу чатырох паліклінік: у пасёлку Усходні, Лошыцы і дзве ў жылым комплексе «Мінск-Свет»: «Акрамя таго, у наступным годзе плануем увесці ў эксплуатацыю аб'ект аховы здароўя на вуліцы Маякоўскага, 31, будаўніцтва якога ўжо працяглы час не можа завяршыць інвестар».

Актыўна забудоўваюцца і гарады-спадарожнікі, у першую чаргу Смалявічы. Будаўніцтва ў такіх населеных пунктах вядзецца сумеснымі намаганнямі Мінска і Мінскай вобласці. Як распавёў першы намеснік старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінскага аблвыканкама Аляксей Быкаў, будаўніцтва вядзецца за кошт трансфертаў, якія паступаюць у абласны бюджэт, а заказчыкам выступае Мінск. У рамках генеральных планаў прадугледжана ўзвядзенне дзіцячых садкоў, школ у новых мікрараёнах горада.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

Ураджай-2024

# ЯК ЛІДАР АПК КРАІНЫ СВЯТКУЕ «ДАЖЫНКІ»




**Горад Масты сёння прымае галоўнае свята хлебаробаў Гродзенскай вобласці. Гасцей раённага цэнтра і яго жыхароў чакае надзвычай разнастайная праграма яскравых мерапрыемстваў.**



Традыцыйнымі і вельмі насычанымі абяцаюць быць падворкі кожнага раёна. Тут можна ўбачыць усю гісторыю развіцця тэрыторыі. Напрыклад, пляцоўка гаспадароў свята верне прысутных у 1997 год, калі Масты прынялі рэспубліканскі фестываль «Дажынкі» з удзелам кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі. Як гэта было, раскажуць кадры фотахронікі. Таксама тут можна даведацца аб самых унікальных рамёствах раёна і паўдзельнічаць у майстар-класах па травапляценні.

Наведвальнікі Лідскага падворка пазнаёмяцца з гісторыяй аграрнай галіны ў пасляваенны перыяд 1943—1955 гадоў. Менавіта ў гэты час пачалася работа ў новых умовах калектыўных гаспадарак раёна. А прадстаўнікі Ваўкавыска адлюструюць усе этапы станаўлення горадаўтваральнага прадпрыемства ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат», які сёлета адзначае 60-гадовы юбілей. Падворак Свіслацкага раёна пакажа і раскажа аб эвалюцыі брэндавага свята — каравай-фэсту «Бацькава булка». Астравецкі раён прадэманструе дасягненні ў малочнай галіне. Акрамя таго, усе прысутныя змогуць ацаніць разнастайныя караваі і снапы, якія прадстаўлены на конкурс кожным раёнам.



Да свайго галоўнага свята аграрыі Гродзеншчыны падыходзяць з добрымі вынікамі. Рэгіён трывала займае лідарства па сельгасвытворчасці ў краіне. Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых культур склала сёлета 48 цэнтнераў з гектара — найлепшы паказчык краіны. Усяго атрымана звыш 2,2 мільёна тон зерня, што з'яўляецца другім вынікам пасля Мінскай вобласці.

У Гродзенскай вобласці сёлета нямала і асабістых рэкардсменаў на жніве. Ёсць нават камбайнер-шасцітысячнік. Найвышэйшы вынік па краіне на жніве 2024 прадэманстраваў працаўнік СВК «Гродзенскі» Гродзенскага раёна Сяргей Шантыр, які намалаціў 6655 тон збожжа. Вядома, падчас свята найлепшыя хлебаробы атрымаюць заслужаныя ўзнагароды. Пераможцаў чакаюць таксама каштоўныя падарункі.

Канцэртная праграма парадуе выступленнямі знакамітых беларускіх і расійскіх выканаўцаў. Некалькі музычных пляцовак, у тым ліку з удзелам прадстаўнікоў дзіцячых музычных школ вобласці, не дадуць засумаваць нікому. А аматарам тэхнікі даспадобы прыйдзецца выстаўка рэтрааўтамабіляў і сельгастэхнікі. Усіх наведвальнікаў чакае шмат цікавых лакацый і інтэрактыўных пляцовак.

Рэгіён вельмі адказна падышоў да падрыхтоўкі свята. Добраўпарадкаванне горада пачалося яшчэ на пачатку года. Было адноўлена 13 кіламетраў гарадскіх вуліц, работу вялі некалькі дарожна-будаўнічых упраўленняў, у тым ліку з іншых раёнаў вобласці.

Змянілася і само аблічча горада. Прыведзены ў парадак будынкі жылых, сацыяльных, культурных аб'ектаў. Па-новаму стаў выглядаць фасад цэнтральнай раённай бальніцы, каля будынка з'явілася вельмі прыгожая інсталяцыя — сэрца ў далоні медыцынскіх работнікаў. Цікавае афармленне атрымаў раённы Дом культуры — яго фасад распісаны беларускім арнаментам.

Горад увогуле вельмі змяніўся ў эстэтычным плане. Прыцягвае ўвагу вялікі мурал на дзевяціпавярховым доме на ўездзе з боку Мінска. Лірычная кампазіцыя спалучыла сям'ю, хлеб, беларускую прыроду. Як расказала намеснік старшыні райвыканкама Марына Давыдзік, работы па ўпрыгожванні вяліся ў адпаведнасці з канцэпцыяй у стылі нацыянальнай сімволікі. З'явілася нямала ўнікальных фотазон. У іх ліку і стары дуб у цэнтры горада, які аформлены казачнымі персанажамі. Сімвал 2024 года — дракон — таксама атрымаў увасабленне на адной з цэнтральных пляцовак.

А падарункам для жыхароў стаў шматпавярховік на 56 кватэр, дзе выдзелена жыллё для шматдзетных сем'яў, маладых спецыялістаў, прадстаўнікоў сілавых ведамстваў. Асаблівасць новага дома ў тым, што гэта першы ў раёне жылы будынак, які поўнасцю на электразабеспячэнні.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота grodnonews.by.**

# «НА КРЫЛАХ» — КАЛЯ 2 МІЛЬЁНАЎ ПАСАЖЫРАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле яго слоў, колькасць перавезеных авіятранспартам пасажыраў вырасла на 11,9 % да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года, пасажыраабарот паветранага транспарту — на 5,2 %. Забяспечана выкананне асноўных ключавых паказчыкаў эфектыўнасці работы эканомікі. Экспарт транспартных паслуг склаў 102,5 % да аналагічнага перыяду мінулага года. Узрос экспарт тавараў, адукацыйных паслуг.

Як адзначыў дырэктар дэпартамента, колькасць абслужаных пасажыраў у аэрапортах Беларусі расце ў параўнанні з мінулым годам і складае 119,6 %. Надаецца таксама вялікая ўвага загрузцы абласных аэрапортаў. Летась пасля працяглага перапынку аднавіла палёты авіякампанія «Белавія» з Гомеля ў Маскву. Ужо ў сакавіку бягучага года пачаліся рэгулярныя рэйсы з Гомеля ў Санкт-Пецярбург, а ў красавіку стартавалі палёты з Брэста ў Маскву.

Таксама павялічылася інтэнсіўнасць палётаў праз Беларусь авіякампаній іншых краін: Кітая — у 10 разоў, Казахстана — амаль у 4 разы, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў — у 2 разы, Узбекістана — у 1,5 раза, Расіі — у 1,5 раза, Турцыі — практычна ў 1,3 раза. Аднавілі палёты праз беларускую паветраную прастору авіякампаніі Азербайджана і Егіпта.

«У зімовы перыяд запланавана выкананне рэгулярных рэйсаў з Нацыянальнага аэрапорта Мінск, аэрапортаў Гомеля і Брэста ў 19 аэрапортаў дзесяці дзяржаў. Наш нацыянальны перавозчык — авіякампанія «Белавія» — летась адкрыў новы напрамак — аэрапорт Дэлі. Нягледзячы на спыненне палётаў у Еўропу, працягваюцца інтэнсіўныя палёты ў Расію, краіны Каўказскага рэгіёна, Сярэдняй Азіі і Блізкага Усходу. Праводзіцца пераарыентацыя палётаў па новых маршрутах і павелічэнне колькасці рэйсаў па дзейных напрамках», — распавёў Ігар Голуб. Таксама павялічыўся аб'ём перавезеных грузаў беларускімі авіякампаніямі (тэмп росту — 112,6 %), грузаабарот (110,3 %), аб'ём апрацаваных грузаў у аэрапортах краіны (101,9 %).

Акрамя таго, наша краіна падпісала 50 міжурадавых і міждзяржаўных пагадненняў аб паветраных зносінах. Па словах Ігара Голуба, летась заключана пагадненне аб паветраных зносінах з Аманам, на мінулым тыдні — з Саудаўскай Аравіяй і Сейшэльскімі астравамі. Завершаны працэдуры ўнутрыдзяржаўнага ўзгаднення і гатовы да падпісання міжурадавыя пагадненні аб паветраных зносінах з Венесуэлай і Кеніяй.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Дырэктар дэпартамента ўпэўнены, што падпісаныя міжурадавыя пагадненні з'яўляюцца прававой асновай для эксплуатацыі і арганізацыі палётаў, спрыяюць умацаванню эканамічных, турыстычных і камерцыйных сувязяў паміж краінамі. Ён дадаў, што пасля вызначэння прававой асновы ўключаюцца ў працу авіяперавозчыкі, у прыватнасці авіякампанія «Белавія», якая на сваім узроўні пачынае ўзаемадзейнічаць з адміністрацыяй аэрапортаў і іншымі арганізацыямі

## «Белавія» перажывае значны рост

Гэтая айчынная авіяцыйная кампанія ў студзені — верасні гэтага года перавезла каля 1,5 мільёна пасажыраў, што амаль на 12 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. На 12 % таксама павялічылася колькасць выкананых рэйсаў, паведаміў на прэс-канферэнцыі **першы намеснік генеральнага дырэктара авіякампаніі па арганізацыі вытворчасці Глеб ПАРХАМОВІЧ.**

«Па выніках гэтага года мы разлічваем ушчыльную наблізіцца да двух мільёнаў перавезеных пасажыраў, — распавёў Глеб Пархамовіч. — Нягледзячы на ўсе тыя абмежаванні, якія існуюць, авіякампанія працягвае развівацца. Магчыма, у іншых умовах мы больш дынамічна развіваліся б, але, тым не менш, не стаім на месцы. Калектыў прыкладае ўсе намаганні, каб задаволіць патрэбы насельніцтва ў авіяперавозках, забяспечыць безаварыйную працу».

## Урумчы — гэта толькі пачатак

Прапрацоўваюцца новыя напрамкі. Значная падзея — старт з 16 снежня палётаў у кітайскі мегаполіс Урумчы. Да яго ў авіякампаніі доўга рыхтаваліся. Па словах першага намесніка генеральнага дырэктара, Урумчы абраны невыпадкова: гэта рэгіён Кітая, які досыць дынамічна развіваецца. Акрамя таго, мясцовы аэрапорт мае вялікі транзітны патэнцыял.

«Мы разлічваем, што гэта першы аэрапорт у Кітаі, у які пачынаем лятаць. У плане ёсць і далейшае развіццё кітайскага напрамку», — адзначыў Глеб Пархамовіч, дадаўшы, што адкрыццё новага рэйса патрабуе вялікіх інвестыцый з боку авіякампаніі.

Ён таксама распавёў, што працягнуцца палёты з абласных аэрапортаў, будуць новаўвядзенні ў палётнай праграме з Нацыянальнага аэрапорта Мінск. Да наступнага летняга сезона адновяцца рэйсы ў Махачкалу і Мурманск, якія карысталіся попытам, але на зімовы перыяд на камерцыйных прычынах спыненыя.

## Аэрапорты як гарады

**Намеснік генеральнага дырэктара РУП «Нацыянальны аэрапорт Мінск» па авіяцыйнай бяспецы і рэжыму Вадзім ПРАЎЛОЦКІ** распавёў пра найбольш папулярныя напрамкі палётаў з і ў беларускую сталіцу.

Па словах Вадзіма Праўлоцкага, авіярэйсы ў Нацыянальны аэрапорт Мінск і з яго выконваюць 10 авіяперавозчыкаў. У іх ліку базавая авіякампанія «Белавія», на якую прыпадае 64,3 % усіх рэйсаў, шэсць расійскіх кампаній («Перамога», «Аэрафлот», «Азімут», «Ікар», Red Wings, «Северсталь»), авіякампаніі з Узбекістана, Кітая і ААЭ.

«Усяго за дзевяць месяцаў авіяперавозчыкамі выканана рэйсаў на 12, 5 % больш, чым за аналагічны перыяд 2023 года. Па выніках года плануем абслужыць (усімі кампаніямі) парадку 2,8 мільёна пасажыраў», — распавёў Вадзім Праўлоцкі.

У ліку найбольш папулярных напрамкаў — Масква, Санкт-Пецярбург, Дубай, Стамбул і Тбілісі. Найбольшая сярэдняя загрузка адзначаецца на рэйсах авіякампаніі «Перамога» з Масквы і Санкт-Пецярбурга, «Азімут» — з Мінеральных Вод, «Рэд Вінгс» — з Самары, «Белавія» — у Тбілісі і Стамбул.

Вадзім Праўлоцкі адзначыў, што, нягледзячы на нестабільную сітуацыю ў авіяцыйнай галіны і складаныя ўмовы гаспадарання апошніх гадоў, у студзені—верасні назіраецца стабільная дынаміка выканання вытворчых паказчыкаў у адносінах да аналагічнага перыяду мінулага года. На 12,4 % узрасла колькасць самалётавылетаў, на 15,2 % — колькасць абслужаных пасажыраў, на 17,8 % — апрацаваных грузаў. Забяспечана прыбытковая праца ўсіх службаў аэрапорта.

Як раней праінфармавалі ў паветранай гавані, дзеянне вясенова-летняга раскладу, якое працавала з 31 сакавіка, скончылася 26 кастрычніка, час выканання рэйсаў па асобных напрамках змяніўся. Некаторыя авіякампаніі на зіму прыпынілі палётную праграму. Так, Расійскі лаўкостар «Перамога» не будзе лятаць у Мінск з Масквы і Санкт-Пецярбурга да сакавіка 2025 года. Беларускі авіяперавозчык «Белавія» прыпыняе рэйсы ў Махачкалу, а таксама ў Мурманск — гэта сезонныя напрамкі.

Пры гэтым з 27 кастрычніка авіякампанія «Азімут», якая выконвае пералёты па маршруце Мінеральныя Воды — Мінск, дадасць яшчэ адзін рэйс.

## Школа пілотаў і рамонт самалётаў

Ігар Голуб нагадаў, што ў нашай краіне фарміруецца Нацыянальная школа пілотаў грамадзянскай авіяцыі. Спецыяльнасць «Лётная эксплуатацыя паветраных суднаў грамадзянскай авіяцыі» адкрыта ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі (БДАА) у 2021 годзе. Першы набор — 10 курсантаў. На сёння іх лётная практыка налічвае два гады, агульны налёт складае 110 гадзін на аднаматорным самалёце. А 14 курсантаў набору 2022 года ўжо наляталі па 40 гадзін.

З ліпеня мінулага года БДАА прыступіла да фарміравання поўнага цыкла падрыхтоўкі — нацыянальнай школы пілотаў грамадзянскай авіяцыі. Курсанты набору 2021 года на бягучы момант атрымалі пасведчанне пілота-аматара PPL.

У наступным годзе ў акадэміі прыступаюць ужо да канчатковага завяршэння падрыхтоўкі. Набыты аднаматорныя самалёты, што дазволіць акадэміі па заканчэнні трэцяга года лётнага навучання ўручыць выпускніку Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі пасведчанне пілота камерцыйнай авіяцыі CPL. Яно адпавядае агульнапрызнаным сусветным стандартам ІКАО, што ў далейшым дазволіць ім працаваць ва ўсіх авіяцыйных арганізацыях не толькі Рэспублікі Беларусь, але і ў Расійскай Федэрацыі, а таксама за мяжой.

Па словах Ігара Голуба, прыйшоўшы ў авіякампанію, выпускнік праходзіць дадатковую падрыхтоўку на канкрэтны тып паветранага судна і атрымлівае пасведчанне «лінейнага» пілота грамадзянскай авіяцыі. Пасля гэтага ён зможа прыступіць да палёту ў складзе экіпажа ў якасці памочніка камандзіра паветранага судна.

Ігар Голуб таксама дадаў, што, пачынаючы з мінулага года, актыўна ўключыўся ў праграму авіябудавання ў нашай краіне Мінскі завод грамадзянскай авіяцыі, вядучае прадпрыемства на прасторах СНД па рамонце і мадэрнізацыі, тэхнічным абслугоўванні самалётаў тыпу Як-40, ТУ-134 і іх мадыфікацый.

Як вядома, асноўны кірунак дзейнасці гэтага рамонтнага завода — рамонт самалётаў Ту-134, Як-40, тэхнічнае абслугоўванне самалётаў Іл-76, Ту-204, Sukhoi Superjet 95, а таксама пераабсталяванне, мадэрнізацыя салонаў самалётаў, выкананне работ па афарбоўцы самалётаў рознага тыпу.

Сёлета на заводзе ўведзены ў эксплуатацыю найноўшы комплекс, адзіны ў краінах СНД па змыўцы і афарбоўцы вонкавай паверхні паветраных судоў і іх тэхнічнага абслугоўвання, які цяпер эфектыўна працуе і выконвае заказы, што паступаюць ад розных краін на нашы рамонтныя заводы. Вялікі вопыт рамонту і мадэрнізацыі авіяцыйнай тэхнікі дазваляе Мінскаму заводу грамадзянскай авіяцыі ўпэўнена прапаноўваць прадукцыю і паслугі спажыўцам ва ўсім свеце.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Звыш 14 мільёнаў чалавек былі вымушаны пакінуць свае дамы з-за канфлікту ў Судане



Эскалацыя гвалту і новыя зверствы ў Судане прывялі да беспрэцэдэнтнага ўзроўню гуманітарнага крызісу, а колькасць перамешчаных асоб перавысіла 14 мільёнаў чалавек. Пра гэта заявілі ў Міжнароднай арганізацыі па міграцыі (МАМ), паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН. «Сітуацыя ў Судане катастрафічная. Па-іншаму не скажаш. Лютуюць голад, хваробы і сексуальны гвалт. Для народа Судана гэта сапраўдны кашмар», — заявіла кіраўнік МАМ Эмі Поўп. Як адзначылі ў МАМ, канфлікт паміж Узброенымі сіламі Судана і Сіламі хуткага рэагавання, які разгарнуўся летась, прывёў да перамяшчэння 11 мільёнаў чалавек унутры Судана, яшчэ 3,1 млн жыхароў збеглі за межы краіны. Эмі Поўп дадала, што некаторыя з найбольш моцна пацярпелых раёнаў Судана застаюцца поўнасцю адрэзанымі ад гуманітарнай дапамогі. Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека Фолькер Цюрк у сваю чаргу выказаў крайнюю занепакоенасць у сувязі з рэзкай эскалацыяй баявых дзеянняў у суданскай правінцыі Эль-Гезіра, у выніку чаго тысячы сем'яў былі вымушаны ўцякаць з правінцыі. Адзначаецца, што, нягледзячы на маштабы патрэб, гуманітарныя арганізацыі, якія працуюць у Судане, адчуваюць востры недахоп фінансавання.

## У Іспаніі аб'явілі трохдзённую жалобу па ахвярах паводкі



Урад Іспаніі аб'явіў трохдзённую жалобу па ахвярах паводкі, якая забрала жыцці больш як 150 чалавек. Аб гэтым заявіў міністр тэрытарыяльнай палітыкі і дэмакратычнай памяці Іспаніі Анхель Віктар Торэс, паведаміла РІА «Новости». Ён таксама выказаў шкадаванне, што не можа даць дакладных даных аб колькасці зніклых без вестак, і запэўніў, што Мадрыд будзе працаваць у супрацоўніцтве з рэгіянальнымі ўладамі для аказання дапамогі пацярпелым. Чыноўнік адзначыў, што матэрыяльны ўрон ад стыхіі аказаўся «вельмі значным», але самае страшнае для краіны — гэта чалавечыя страты. Стыхія асабліва моцна закранула Валенсійскую супольнасць, Кастылію-Ла-Манчу і Андалусію. У Валенсіі былі аб'яўлены максімальныя чырвоны ўзровень небяспекі. Рэгіён сутыкнуўся з наймагутнейшымі ападкамі з 11 верасня 1966 года. Як паведаміла «Бі-бі-сі», за восем гадзін у частцы паўднёва-ўсходняй Іспаніі выпала больш чым гадавая норма ападкаў, што і прывяло да раптоўных паводак. Ратавальныя аперацыі працягваюцца. Доступ у некаторыя раёны па-ранейшаму абмежаваны.

## У ЗША кампанія PepsiCo закрывае чатыры заводы па разліве напояў

Кампанія PepsiCo заявіла, што плануе закрыць чатыры заводы па разліве напояў у ЗША, паведаміла ABC News. Закрыццё закране 136 работнікаў у штаце Цынцынаці, 131 — у Чыкага, 127 — Гарысбергу (штат Пенсільванія) і каля 50 — у Атланце. Раней у гэтым месяцы PepsiCo паведаміла, што знізіліся продажы, бо спажыўцы ў ЗША, Кітаі і іншых краінах адмовіліся ад пакупкі напояў і закусак кампаніі з-за пастаяннага павышэння цэн. Продажы напояў PepsiCo ў Паўночнай Амерыцы ўпалі на тры працэнты як у другім, так і ў трэцім кварталах гэтага года. Чысты прыбытак PepsiCo зменшыўся на 5 працэнтаў у перыяд з ліпеня да верасня.

# «Засталіся ў вушах толькі адны воплескі і крыкі «ўра»...

## Што пісалі пісьменнікі-дэлегаты пра Народны Сход Заходняй Беларусі

**Восемдзесят пяць гадоў таму, 28—30 кастрычніка 1939 года, у будынку гарадскога тэатра Беластоку адбыўся Народны Сход Заходняй Беларусі, на якім аднагалосна была зацверджаная Дэкларацыя па пытанні аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Сярод дэлегатаў гэтага з'езда меліся і беларускія пісьменнікі. Што ж яны пакінулі ва ўспамінах і мастацкіх творах пра тую знакавую для нашага народа падзею? Давайце разам паглядзім...**


Пiлiп Пестрак.


Янка Купала.


Якуб Колас.


Міхась Машара.

### «Потрясающее, глубоко волнующее впечатление произвело это собрание»

*«Дні беспрасвецця*
*ў нябыт адышлі,*
*Сонца ўзыходзіць над краем.*
*Вольныя людзі раскутай зямлі,*
*Песню вас мы вітаем.*
*Збіты кайданы чорнае ночы,*
*Сцёрты старыя скрыжалі.*
*Смела наперад,*
*люд наш рабочы,*
*К шчасцю ў шырокія далі...»*

Гэты верш народны паэт Беларусі Якуб Колас прымяркоўваў менавіта да Народнага сходу, і надрукаваны ён у газеце «Звязда» 28 кастрычніка 1939 года. Для Якуба Коласа падзел Беларусі быў вялікай трагедыяй, бо па той бок мяжы апынуліся яго радзіма і частка яго сям'і. Таму Колас адным з першых вітаў уз'яднанне. І ўжо 8 кастрычніка 1939 года ў складзе брыгады беларускіх пісьменнікаў выехаў у Беласток для правядзення творчых вечароў і ўдзелу ў падрыхтоўцы да выбараў у Народны сход. Менавіта Якуб Колас гаварыў прывітальнае слова да яго дэлегатаў.




Свае ўражанні ад Народнага сходу Якуб Колас выказаў у лісце да паэта і перакладчыка Сяргея Гарадзецкага 2 лістапада 1939 года: *«Вчера возвратился из поездки в Западную Белоруссию. Ездил в составе делегации от трудящихся Советской Белоруссии для приветствия Народного собрания. Потрясающее, глубоко волнующее впечатление произвело это собрание. Мне никогда еще не случалось видеть такой съезд, такой народный сход, где бы с такой силой изливалась душа народа, его горькая обида... Меня также глубоко взволновало и то обстоятельство, что белорусский народ не забыл и своих певцов, меня и Купалу, и выразил нам огромную свою признательность... Я встретил много лиц, рассказавших о своём жизненном пути. Сколько тем для поэта и писателя!..»*

### «Аб нашай сустрэчы на вольнай і ўз'яднанай нашай роднай беларускай зямлі»

*«Ты з Заходняй, я з Усходняй*
*Нашай Беларусі,*
*Больш з табою ўжо ніколі*
*Я не разлучуся».*

На з'яднанне Беларусі адгукнуўся і Янка Купала. Разам з Якубам Коласам ён ездзіў у кастрычніку ў Беласток, сустракаўся з літаратарамі Заходняй Беларусі. Стаў ён і дэлегатам Народнага сходу. Вось што ўспамінае пра сустрэчу з ім паэт Міхась Машара:

*«І вось, калі пасля вызвалення Заходняй Беларусі на Народным сходзе ў Беластоку 28 кастрычніка 1939 года мне сказалі, што на сходзе прысутнічае Янка Купала, — я не адразу паверыў у гэта. Той дзень у маім жыцці быў днём неспадзяваных сустрэч. Тут я ўпершыню пазнаёміўся з Аляксеем Сурковым і Аляксандрам Твардоўскім. Толькі расстаўся з імі, як да мяне падышоў Пятрусь Броўка.*

*— Зараз пазнаёмлю цябе з Янкам Купалам, — сказаў ён.*

*Сэнс гэтых слоў не адразу дайшоў да маёй свядомасці. Янка Купала — чалавек, з якім можна было гаварыць у начной цішыні астрожных адзіночак, з якім можна было сябраваць толькі ў думках і марах, цяпер увасабляўся ў рэальнага чалавека.*

*Я не паспеў добра разабрацца ў агарнуўшых мяне думках і пачуццях, як ужо стаяў перад высокай постаццю нашага народнага песняра. Ён працягнуў мне руку і нешта гаварыў пра толькі што прачытаны мой верш. Я стаяў перад ім, пацiскаў яго руку і не мог нават слова прамовіць ад хвалявання і разгубленасці.*

*У мяне ў руках быў дэпутацкі блакнот. Янка Купала ўзяў яго і, адышоўшы крыху да акна, напісаў на першай старонцы: «Дарагому Міхасю Машару на памяць аб нашай сустрэчы на вольнай і ўз'яднанай нашай роднай беларускай зямлі. Шчыра жадаю поспеху ў жыцці і працы. Янка Купала».*

### «Усё гэта вылівалася аж за берагі»

Да вызвалення Заходняй Беларусі Піліп Пестрак паспеў зведаць пекла панскіх турмаў напоўніцу — ад перанесеных катаванняў страціў усе валасы, займеў невылечныя хваробы... І з жонкай сваёй пазнаёміўся ў вязніцы — яна таксама была камсамолка і падпольшчыца. 17 верасня 1939 года Піліп і Анастасія сустрэлі ў гарадзенскай турме. Даведаўшыся пра наступленне Чырвонай Арміі, вязні пачалі выломваць замкі на дзвярах камер. І Пестрак змог праз краты турэмнага калідора працягнуць руку каханай: *«І так упершыню нашы рукі дакрануліся адна да адной».*

Пасля перажытае Піліп Пестрак апіша ў рамане «Сустрэнемся на барыкадах». Раман заканчваецца тым, як галоўныя героі, Андрэй і яго каханая Надзя, едуць на Народны Сход Заходняй Беларусі як члены паўнамоцнай камісіі.

*«Ад Народнага Сходу засталіся ў вушах толькі адны воплескі і крыкі «ўра»... Безупынныя воплескі. Аж душа ўжо не магла іх стрымліваць. Там гаварыліся прамовы, прымаліся рашэнні аб нацыяналізацыі фабрык, заводаў, банкаў, зямлі, лясоў, рэк і азёр. Галоўнае, была радасць, было захапленне ад сустрэчы з усходнімі свабоднымі братамі. Усё гэта вылівалася аж за берагі. Хацелася толькі глядзець на іх, доўгачаканых, усміхаца і вітаць узрывамі радасці. Кожны ў душы гаварыў: «Навошта тут афіцыйныя пастановы? І так усё даўно ясна. Усё зразумела само сабою». Але пастановы, безумоўна, патрэбны. Гісторыя народа ёсць вялікая кніга, якую трэба дапісаць, давесці да ведама ўсіх, пакінуць патомкам.*

*Надзя шаптала на вуха бледнаму як палатно ад бяссонніцы Андрэю. Ён быў у сваім горадзе старшынёю акруговай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў у Народны Сход і стомлены пасля бяссонных начэй прыехаў на сход як дэпутат. Надзя шэпча яму на вуха:*

*— Глядзі, вунь сядзіць першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі.*

*— Дзе, дзе? — замітусіўся Андрэй.*

*— Вунь, у ложы, пасярэдзіне...*

*Андрэй прыглядзеўся да смуглявага чалавека з чорнымі вачыма і чорнымі бровамі, у ваеннай форме. Ён сядзеў сярод ваенных, найбольш з ромбамі на пятліцах мундзіраў».*

Гаворка ідзе пра першага сакратара ЦК КП(б)Б Панцеляймона Панамарэнку — зразумела, Пестрак апісвае ўласныя ўражанні. Выказаўся ён і ў вершах:

*«Рубеж крывавы змыт.*
*Дзяржаўны крок грыміць.*
*Свабодных дзён краса*
*у зорах пяцікутных*
*Да сонца сцеле шлях*
*для радаснай зямлі,*
*Руйнуе ўсе сляды*
*народнае пакуты».*

### «Паслаў народ ад шэрых стрэх сялянскіх хатаў...»

Першая кніга вершаў Міхася Машары з'явілася, калі паэт сядзеў у турме, віленскіх Лукішках — дзякуючы паэтцы Людвіцы Войцік, якая насіла яму перадачы і спарадкавала перададзеныя з няволі аркушыкі з вершамі ў зборнік «Малюнкі». Надышло 17 верасня 1939 года. Міхася Машару землякі на сходзе працоўных Шаркаўшчыны вылучылі кандыдатам у дэлегаты Народнага сходу ў Беластоку, потым за яго дружна прагаласавалі — бо ўсе ведалі паэта-змагара з бядняцкага хутара. Ён браў удзел у Народным сходзе, потым у сесіі Вярхоўнага Савета СССР, дзе прымалася рашэнне аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюза. Тады ж быў напісаны верш "Прывітанне":

*«Нашу ў грудзях*
*я сонечнае шчасце,*
*У сэрцы радасці ніяк мне*
*не стрымаць;*
*Не маю слоў, каб радасць гэту*
*ў рыфмы ўкласці*
*І гэта шчасце песні перадаць...*
*Учора быў батрак,*
— Гэта вялікая праца школы, якая чатыры дзясяткі гадоў, як бы ёй ні было складана, працуе і развіваецца. Камандзе дапамагае будаўнічая галіна. Плюс у Брэсце працуе дзіцячая школа, якая нядрэнна падсілкоўвае каманду. Сумесная праца і дае вынік. Сёння нашы асноўныя канкурэнты — «Мінск»: у мінулым сезоне выйгралі яны, перад гэтым перамагалі мы. У гэтым сезоне варта пазмагацца за першае месца. У Баранавічах працуе каманда «Тэкстыльшчык» — адна з самых маладых жаночых каманд у чэмпіянаце. Калі супаставіць умовы «Мінска» і «Тэкстыльшчыка», то дзяўчынкі з Баранавічаў паказваюць вельмі добры вынік. Гэта маладыя кадры, якія будуць добрым падмацаваннем для нацыянальнай зборнай. Мы ўжо бачым, што ў Баранавічах вырастаюць вельмі моцныя хакеісткі на траве. Напрыклад, Наталля Шчін, чэмпіёнка Еўропы сярод моладзі.

***— Апошнія некалькі гадоў Брэст прымае шмат спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы. Як вядома, каралева спорту прысутнічае ва ўсіх школах вобласці. Але ці падрастае недзе другая Юлія Несцярэнка?***

— Мы сапраўды лідары ў развіцці лёгкай атлетыкі. Абласны цэнтр алімпійскага рэзерву працуе сумленна, стадыён «Дынама» — вельмі якасны аб'ект. Прыемна, што Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі стала звяртаць увагу на рэгіёны і праводзіць свае мерапрыемствы тут. Чаго толькі вартыя матчавыя сустрэчы Саюзнай дзяржавы, якія праходзілі летам. Расійская каманда на гэтыя спаборніцтвы прывезла сваіх найлепшых спартсменаў. Нашы выступілі на максімуме сваіх магчымасцяў — медалі былі. Але ў той жа час мы ўбачылі, што нам ёсць куды імкнуцца, таму што расійскія лёгкаатлеты на галаву вышэйшыя за нашы. Але ў нас працуюць кампетэнтныя трэнеры, якія думаюць на перспектыву. Наша тактыка — «не нацягаць» спартсмена дзеля медалёў і бліскучых вынікаў на юніёрскім узроўні. Мы жадаем падрыхтаваць спартсменаў, якія будуць прыносіць медалі на галоўных стартах і ў ідэале не адзін алімпійскі цыкл. Таму задачы перамагчы ўсіх і ўся перад юнымі лёгкаатлетамі не стаіць. Дасведчаныя трэнеры плаўна рыхтуюць іх да вялікай будучыні.

***— Юрый Сцяпанавіч, вылучыце, калі ласка, тры раённыя цэнтры — лідараў у развіцці спорту.***

— Вылучу пяць: Кобрын, Івацэвічы, Столін, Іванава і Пружаны. У Іванаве і Століне добра развіта масавая работа з насельніцтвам, базы там пустымі ніколі не бываюць. У Іванаве працуе калектыў, які шчыра хвалюецца за вынік і імкнецца рабіць усё магчымае, каб развіваць галіну ў раёне. Івацэвічы вельмі добра працуюць над развіццём футбола і лёгкай атлетыкі. Дарэчы, у Баранавіцкім раёне ёсць выдатная лыжаролерная траса, дзе праходзіць мноства аматарскіх спаборніцтваў па лыжных гонках. Баранавічы і Ганцавічы — школы, якія захоўваюць свае лыжныя традыцыі, але нашы цёплыя зімы не дазваляюць ім разгарнуцца ў прафесійным плане.

***— У Брэсцкай вобласці каласальныя спартыўныя традыцыі. Як яны захоўваюцца?***

— Мы захавалі музей алімпійскай славы, цяпер яго абнаўляем. Юлія Несцярэнка, наш гонар, часта сустракаецца з навучэнцамі алімпійскага рэзерву, з юнымі спартсменамі. Мы стараемся запрашаць і іншых знакамітых спартсменаў, якія родам не з Брэсцкай вобласці, але чые гісторыі натхняюць. У верасні ў вучылішча алімпійскага рэзерву прыязджаў Андрэй Барбашынскі. У нас былі такія легенды, як Аляксандр Карэлін, Уладзімір Сальнікаў. Мы разумеем, што юныя спартсмены павінны расці на прыкладах герояў спорту, з першых вуснаў чуць сакрэты іх перамог. Ды і, чаго граху ўтойваць, мы, дарослыя, у такіх людзей таксама шмат чаму вучымся.

***— Юрый Сцяпанавіч, чаму асабіста вы навучыліся за час работы ў спартыўнай галіне?***

— Спорт — гэта асобны свет, у якім жывуць людзі са сваёй філасофіяй. Гэта сфера, у якой пастаянна вучышся, адкрываеш кожны від спорту, паглыбляешся ў яго спецыфіку. Мусіць, дзякуючы спорту я стаў некалькі інакш глядзець на падыход да працы, на жыццё ў цэлым — я вельмі многаму навучыўся ў спорце. І працягваю вучыцца кожны працоўны дзень.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*Брэст.*

Па той бок медаля

# «Нават калі б не было медаля, з Парыжа я б ехаў самым шчаслівым: сын — самая галоўная ўзнагарода ў жыцці»

**31 студзеня 2014 года ў Магілёўскае абласное вучылішча алімпійскага рэзерву паступіў хлопец з пасёлка Краснаполле. Зборы, спаборніцтвы, першыя перамогі і паражэнні — звычайны шлях спартсмена. 3 жніўня 2024 года на п'едэстале Алімпійскіх гульняў у Парыжы стаяў член нацыянальнай зборнай па веславанні акадэмічным Яўген ЗАЛАТОЙ. Да гэтага ён ні разу не станавіўся прызёрам дарослых чэмпіянатаў свету ці Еўропы. Але Алімпійскія гульні прайшоў па-чэмпіёнску ўпэўнена. З каляіны яго не маглі выбіць ні праблемы з лодкай, ні зламаны аўтобус па дарозе на фінальны заезд, ні масцітыя сапернікі побач. Відаць, сапраўды, складаныя часы нараджаюць моцных людзей. Сам Яўген гаворыць аб тым, што да гонкі на Алімпіядзе ён ішоў 10 гадоў. 10 гадоў працы дзеля 6 хвілін 42.96 секунд — такое магчыма толькі ў спорце. У інтэрв'ю «Звяздзе» Яўген Залатой расказаў, які быў гэты шлях і як змяніўся пасля алімпійскага медаля, першага мужчынскага медаля для айчыннага акадэмічнага веславання.**

***— Яўген, праз два месяцы пасля Алімпійскіх гульняў прыйшло ўсведамленне, што твой медаль — гэта сапраўды вялікае дасягненне?***

— Не магу сказаць, што адчуваю, быццам зрабіў нешта грандыёзнае. Грэе душу думка, што я апынуўся ў тройцы наймацнейшых на спаборніцтвах, дзе збіраюцца найлепшыя спартсмены свету. У мяне заўсёды перад вачыма быў прыклад чалавека з сапраўды гучнымі спартыўнымі дасягненнямі — Кацярыны Анатольеўны Карстэн. Мне да яе яшчэ расці і расці. Так, у нас раней не было алімпійскіх мужчынскіх медалёў, мне, вядома, прыемна, што я заваяваў першы. Усведамленне, што мой медаль сапраўды важны для краіны, прыйшоў 17 верасня, калі Прэзідэнт узнагародзіў ордэнам Пашаны. Бо не проста так кіраўнік дзяржавы будзе ўручаць дзяржаўную ўзнагароду, значыць, зрабіў нешта важнае. Для мяне было вялікім гонарам сказаць адказнае слова ад імя ўсіх спартсменаў і трэнераў. Загадзя ўсё абдумаў, што сказаць, бо не ўяўляю, як без падрыхтоўкі выступаць на такую аўдыторыю. Мусіць, атрымалася не занадта красамоўна, але ад душы. Хваляванне было такое ж, як і на Алімпійскіх гульнях: не кожны дзень даводзіцца выступаць перад найлепшымі ў сваіх сферах людзьмі, перад Прэзідэнтам. Але, калі пачаў казаць, хваляванне як рукой зняло.

***— Як ты ўспрымаеш павышаную ўвагу, якая літаральна абрынулася на цябе пасля Алімпіяды. Да інтэрв'ю і мерапрыемстваў прывык?***

— Мне здаецца, я за ўсё жыццё не даваў столькі інтэрв'ю, колькі за апошнія два месяцы. Мне гэта даецца няцяжка. Ведаю, што, напрыклад, нашы батутысты не любяць даваць інтэрв'ю, хаця насамрэч яны вельмі пазітыўныя і цікавыя. Мне падабаецца расказваць не столькі пра сябе, колькі пра свайго трэнера і пра свой від спорту. Я разумею, што дзякуючы маім інтэрв'ю людзі больш даведваюцца пра акадэмічнае веславанне, пра шлях, які мы праходзім кожны дзень. Трэба глядзець праўдзе ў вочы, многія з акадэмічнага веславання ведаюць толькі Кацярыну Карстэн, але ж з'явіліся і новыя імёны. Таму мне важна, каб аб акадэмічным веславанні ведала як мага больш людзей, каб на нашы спаборніцтвы збіраліся балельшчыкі. Таму што падтрымка трыбун — гэта неверагодна. Жадаю кожнаму спартсмену адчуць гэта.

***— У Парыжы быў натуральны канал, у Брэсце вы трэніруецеся на штучным. Для непрафесіяналаў растлумач, калі ласка, у чым розніца для весляра?***

— Розніца ў тым, што на штучным канале глыбіня ўсюды аднолькавая, бо вада на адным узроўні. На натуральным на розных дарожках розная глыбіня. Напрыклад, на натуральным канале ў Сербіі другая дарожка больш хуткасная, бо там глыбіня большая, чым на шостай. З адным і тым жа тэмпам на адной і той жа адлегласці час на гэтых



дарожках будзе розны. Вось гэта галоўная асаблівасць натуральнага вадаёма, да якой павінен быць гатовы кожны прафесіянал. На штучным канале ж усё плюс-мінус у аднолькавых умовах, калі вецер не перашкодзіць. Розныя каналы бываюць, але мне пашанцавала: мне не сустракаўся надта жудасны канал, на якім было б немагчыма ездзіць. Часам асаблівасці канала — не самае страшнае, з чым даводзіцца сутыкацца.

***— Што аднясеш у разрад страшнага?***

— Ды шмат чаго. Напрыклад, падчас падрыхтоўкі да Алімпіяды я захварэў, з-за чаго страціў шмат часу. Вельмі гняце, калі перад Алімпійскімі гульнямі ляжыш дома з высокай тэмпературай, а не трэніруешся. Потым прыйшлося вельмі хутка ўсё наганяць, але з-за хваробы кіламетраў 600—700 з запланаванага аб'ёму не дабраў. Зламаны аўтобус па дарозе на алімпійскі фінал — зусім не тое, з чым хацелася б сутыкнуцца. Трэнер да апошняга не верыў, што зламаўся аўтобус і заезд пераносіцца. Такая сітуацыя можа лёгка выбіць з каляіны. Але я псіхалагічна ўстойлівы і таму асабліва з гэтай нагоды не нерваваўся. Адзіная праблема была з харчаваннем, таму што звычайна за тры гадзіны да старту я не ем, а гонка адклалася, і ўжо хацелася есці. Добра, што паклаў з сабой беларускі зефір, таму, пакуль усе нерваваліся з-за зламанага аўтобуса і адкладзенай гонкі, я спакойна размінаўся і еў зефір. Дарэчы, надаўна з трэнерам успаміналі тую гонку і дайшлі да высновы, што рэальна магло б быць першае месца. Немец Цайдлер, які перамог, па хвалі хадзіць не любіць. А я ж да хваляў прывык, яны ў Брэсце пастаянна. І пакуль я сядзеў у аўтобусе, трэнер патэлефанаваў і сказаў, што паднімаецца хваля. Здавалася б, лёс. Я даехаў да канала — а там штыль. Таксама, напэўна, лёс.

***— Ты расказваў, што перад Алімпіядай у цябе было па 13 трэніровак у тыдзень — гэта значыць, па дзве трэніроўкі за дзень шэсць дзён на тыдзень і адна ў нядзелю. Пры гэтым вельмі доўга было невядома — пусцяць цябе на Алімпійскія гульні ці не. Шмат хто можа задаць пытанне — навошта працаваць у такім рэжыме, не будучы ўпэўненым у сваім выступленні на Алімпіядзе?***

— А навошта працаваць у якой-небудзь арганізацыі, калі цябе могуць звольніць? Мы ўсе імкнёмся выконваць сваю працу максімальна добра. І калі стаіць пытанне, ці будзе Алімпіяда, ёсць варыянт, што яна будзе. А значыць, усё роўна трэба быць максімальна гатовым. Так, гэта пэўная рызыка здароўем, вельмі шмат часу і сіл. Але ў спорце інакш немагчыма. У кожнага спартсмена ёсць адна мэта, мара — медаль Алімпійскіх гульняў. Я не ўяўляю, як можна расслабіцца, калі на коне гэты медаль. Кожны, хто выступіў на Алімпійскіх гульнях, — герой, таму што прайшоў неверагодна складаны шлях. Так, на спаборніцтвах мы змагаемся з сапернікамі, але самае цяжкае спаборніцтва спартсмены праходзяць у жыцці — барацьбу з самім сабой. Кожны спартсмен ставіць перад сабой вельмі шмат «не», шмат у чым сабе адмаўляе толькі для таго, каб выступіць на Алімпійскіх гульнях. Таму мне нават страшна ўявіць, як бы я сабе адчуваў, калі б мяне не дапусцілі на Алімпіяду. Упэўнены: выступаць на іншых спаборніцтвах было б маральна цяжка, нягледзячы на добрую фізічную падрыхтоўку. А чуць «мог бы ўзяць медаль на Алімпіядзе» і зусім было б невыносна. Нават не ўпэўнены, ці застаўся б я ў спорце пасля такога. Таму я вельмі спачуваю тым, у каго забралі гэтую магчымасць, разумею, наколькі ім балюча.

Перад Алімпійскімі гульнямі ў Парыжы я меркаваў, што ў беларусаў будзе шэсць медалёў — амаль угадаў. Але затое якія гэта медалі! Жэня Ціханцоў зладзіў сапраўднае шоу. Я не спецыяліст у цяжкай атлетыцы, але, думаю, гэта не мяжа. Ваня Літвіновіч — герой: дзве Алімпіяды запар з залатымі медалямі. Віялета Бардзілоўская — разумніца: ад яе ж наогул ніхто медаля не чакаў. Мы, канешне, таксама меркавалі, што ў мяне будзе медаль, разлічвалі на другое-трэцяе месца, мае паказчыкі на гэта ўказвалі. Вядома, услых аб маім медалі ніхто не казаў. Але настройваліся толькі на найлепшы вынік.

***— Дзеля ўдзелу ў Алімпіядзе табе прыйшлося з двойкі і чацвёркі пераключыцца на адзіночку. Складаны быў пераход?***



— Больш цяжка маральна. У двойцы ці ў чацвёрцы ў цябе ёсць падтрымка. А ў адзіночцы ты можаш разлічваць выключна на сябе, трэба дакладна разумець, што ніхто, акрамя цябе самога, не дапаможа. На трэніроўках адзіночнікі працуюць больш. Напрыклад, у двойцы парнай 500 метраў мы праязджаем за 1 хвіліну 30 секунд, а ў адзіночцы — за 1 хвіліну 40 секунд. Здавалася б, 10 секунд. Але калі ўзяць 10 такіх адрэзкаў — то гэта праца на 100 секунд большая, а для весляра гэта істотна. На трэніроўках 30 кіламетраў на вадзе ў адзіночцы я еду за 2,5 гадзіны, у двойцы — за 1 гадзіну 45 хвілін. Розніца каласальная. Але калі прывыкаеш і бачыш вынік, аб складанасцях ужо не думаеш. Многія ж здаюцца, таму што не бачаць выніку.

***— Алімпійскі медаль і нараджэнне сына — дзве найважнейшыя падзеі адбыліся з розніцай у тры дні. Як гэта, калі столькі шчасця?***

— Нават калі б не было медаля, з Парыжа я б ехаў самым шчаслівым: Марк — самая галоўная ўзнагарода ў жыцці. Быў варыянт пасля выступлення застацца ў Парыжы, пабалець за нашых хлопцаў, але я рваўся дадому, каб хутчэй сустрэцца з сынам. Медаль — гэта вельмі добра, гэта матывацыя працаваць яшчэ больш і лепш. А дзіця — гэта матывацыя наогул ніколі не спыняцца на дасягнутым, таму што хочацца даць яму ўсё самае лепшае, стварыць яму ўсе ўмовы для шчаслівага дзяцінства, для развіцця. Цяпер многія цікавяцца, куды я патрачу прызавыя. Канешне, яны пойдуць на сям'ю, на сваё жыллё. Я лічу, першая задача кожнага мужчыны — забяспечыць сям'ю сваім жыллём, забяспечыць тыл.

***— Да ролі бацькі прывык?***

— Быць бацькам няпроста. Многія казалі, што першыя тры месяцы дзіця толькі спіць і есць — нічога падобнага. Ну, ці наш такі, хлопец з характарам. Толькі адыдзеш ад яго, крык стаіць такі, што ўся акруга чуе. Ці гэта скокі росту, ці непакоіць нешта — хвалюемся кожны раз. Мусіць, мы нават больш ходзім па дактарах, чым трэба, таму што кожны раз яны нас супакойваюць, што дзіця ў норме. Але ж мы першы раз сталі бацькамі. Усе складанасці цьмянеюць у параўнанні з гэтым шчасцем.

***— Яўген, вядома, што пачынаў ты з гандбола і лёгкай атлетыкі, але ў выніку апынуўся ў акадэмічным веславанні. Цікавы шлях...***

— Я заўсёды ведаў, што буду спартсменам: вельмі не хацелася руціннай працы. У школе не гарэў вялікім жаданнем вучыцца. А на спаборніцтвах выступаў з задавальненнем. Мне вельмі падабалася бегаць на доўгія дыстанцыі. Мяне нават узялі на збор у вучылішча алімпійскага рэзерву. Але для бегу я аказаўся занадта вялікім, затое мяне заўважыў трэнер па кіданні молата, я быў не супраць, пачалі працаваць. А веславанне мяне нібы само шукала. Спачатку ў школу прыехалі трэнеры з Гомеля, але я захварэў. У наступны іх прыезд я вырашыў школу прагуляць, мусіць, першы раз у жыцці аб гэтым шкадаваў. Калі прыехалі Алег Юр'евіч Дудко і Андрэй Уладзіміравіч Шчамялёў і мяне паклікалі ў кабінет дырэктара, я ўспомніў усе свае грахі, але ніяк не чакаў, што гэта будуць трэнеры па веславанні. Вядома, я пагадзіўся папрацаваць з імі. Але тата сказаў, што няма чаго кідацца сюды-туды. Я патэлефанаваў Андрэю Уладзіміравічу і сказаў, што ў Гомель мяне бацькі не адпускаюць. Пачуў у адказ: «Ты што, баклан, мы з Магілёва». У Магілёў мяне бацькі спакойна адпусцілі. Шчасцю не было мяжы. Вельмі хацелася ў вучылішча алімпійскага рэзерву, хацелася вырвацца з Краснаполля, свабоды хацелася. Дзеля гэтага я быў гатовы на ўсё. Трэнер сказаў, што для паступлення ў вучылішча патрэбен сярэдні бал, не ніжэйшы за сем. А ў мяне быў 6,9 — ох як я стараўся, як вучыў. Потым, праўда, аказалася, што нічога такога не трэба, проста трэнеры вырашылі патрымаць мяне ў тонусе.

***— Вельмі незвычайна, што хлопца, які займаўся кіданнем молата — заўважылі трэнеры па веславанні...***

— На самай справе акадэмічнае веславанне і кіданне молата, блізкія віды спорту. Спартсмены і там, і там высокія, шыракаплечыя, моцныя. Тыя, у каго ёсць выбухная сіла, але няма цягавітасці (а гэта самае галоўнае ў веславанні), ідуць у кіданне. А калі ёсць цягавітасць, але няма выбухной сілы, то лепш звярнуць увагу на акадэмічнае веславанне. У мяне, як нескладана здагадацца, добрая цягавітасць, але няма выбухной сілы.

***— Вяртаючыся да Алімпіяды. Яўген, вось сапраўды, няўжо ў глыбіні душы не было ні кроплі шкадавання, што ўсё-ткі не залаты медаль?***

— Шчыра, не было. Прайграваць заўсёды балюча і крыўдна. Але гонар за тое, што я змог заваяваць медаль, за тое, што ў такіх складаных умовах парадаваў краіну, мацнейшы. Калісьці і сярэбраны медаль Алімпіяды здаваўся нечым немагчымым, але ён стаў рэальнасцю. Значыць, і золата цалкам рэальна. Складана знаходзіць матывацыю, калі выйграў Алімпійскія гульні, чэмпіянаты свету, устанавіў рэкорды, напрыклад Цайдлеру. А мне яшчэ ёсць куды імкнуцца.

***— Спорт — вельмі асаблівая сфера, якая патрабуе поўнай самааддачы, але і ўзамен дае нямала. Што спорт даў табе, акрамя імя, медалёў, заробку?***

— Характар. Спорт развіў ува мне мэтанакіраванасць. Ён навучыў: што б ні здарылася, уставаць і ісці далей. Мне падаецца, гэта пацвердзіць любы спартсмен. Бо, спартсмены не ведаюць, што такое лянота. Кожны дзень мы пераносім шалёныя нагрузкі, таму што хочацца быць лепшым, чым учора. Мне гэта часам замінае, таму што залішне сябе нагружаю. Але спорт таксама вучыць знаходзіць баланс, чуць і разумець сябе.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота НАК Беларусі і БелТА.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390, (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270. |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении. Месторасположение: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1. | FORD TRANSIT CONNECT «INDEEC» 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9564-7 | 15 000,00 |
| 2. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9575-7 | 15 000,00 |
| 3. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8108-7 | 15 000,00 |
| 4. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8110-7 | 15 000,00 |
| 5. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 9602-7 | 15 000,00 |
| 6. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294595, 2011 г. в., рег. знак АР 8122-7 | 15 000,00 |
| 7. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-02, 2011 г. в., рег. знак АР 8123-7 | 21 720,00 |
| 8. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8131-7 | 18 960,00 |
| 9. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591, 2011 г. в., рег. знак АР 8121-7 | 12 240,00 |
| 10. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8109-7 | 15 000,00 |
| 11. | FORD TRANSIT CONNECT VAN INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8118-7 | 18 960,00 |
| 12. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9601-7 | 18 960,00 |
| 13. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8094-7 | 18 960,00 |
| 14. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8098-7 | 18 960,00 |
| 15. | FORD TRANSIT INDEEC 29459101, 2011 г. в., рег. знак АР 8143-7 | 15 000,00 |
| 16. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8126-7 | 15 000,00 |
| 17. | FORD TRANSIT CONNECT «INDEEC» 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9563-7 | 12 240,00 |
| 18. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8142-7 | 21 720,00 |
| 19. | FORD CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9560-7 | 15 000,00 |
| 20. | VOLKSWAGEN CADDY PYCAR 294544-03, 2010 г. в., рег. знак АР 8201-7 | 12 960,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390.

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после торгов.**

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы». Страница лота содержит информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену.

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов, без объяснения причин снятия.

Предыдущее извещение опубликовано в г. «Звязда» 04.10.2024.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 19.11.2024 с 11:00 до 12:00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.11.2024 до 17:00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу **www.ipmtorgi.by.**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. Email: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (Организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Копыльский райагросервис» (Продавец) проводит открытый аукцион по продаже

**здания конторы с инв. 642/С-12116 общей площадью 255,5 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622885000001000027 площадью 0,1534 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, 7.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **— 7 620,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены — **762,00** бел. руб. **Стоимость снижена на 50 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа — 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.09.2024.

Аукцион состоится **14.11.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.11.2024** до **16.00** в каб. 320 по указанному адресу. **Тел: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра: (801719) 2-85-01, 8(044) 734 38 40.**

УНП 600018956

## Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 3 декабря 2024 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Семейная, 9 микрорайон «Барановичи-7», У-35 440100000003005680 | 0,0967 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение. Фундамент: железобетон; площадь застройки: 120 кв. м | 26 042,51 (7 292,38; 18 750,13) | 363,14 | 5 200,00 |

Земельный участок расположен в охранной зоне электрической сети (0,0034 га). Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан в течение срока строительства возместить затраты на инженерную и транспортную инфраструктуру в соответствии с постановлением Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского горисполкома от 12.04.2022 г. № 260

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны + 375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594 получатель — коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ — доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан — документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 3 декабря 2024 года в 12:00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал). Прием документов, консультации и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 4 ноября по 27 ноября 2024 года включительно в рабочие дни с 08:00 до 13:00 и с 14:00 до 17:00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона — победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гродногазстройизоляция».**

Аукцион состоится 21.11.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

| Лот № 1 | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | Лот № 1: микроавтобус GAZ 322132, допустимая полная масса 3500 кг, свидетельство о регистрации САА 404379, дата выдачи 04.01.2014, рег. знак AI 3547-4, номер кузова (рамы) X96322132E0769424, 2013 года выпуска, пробег автомобиля составляет 281409 км. Местонахождение автомобиля: Брестская обл. г. Ивацевичи, 40 лет Октября, 3 |
| Начальная цена продажи | **ЛОТ № 1 —** 7 560 р. (семь тысяч пятьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | **ЛОТ № 1 —** 756 р. (семьсот пятьдесят шесть рублей) |
| Реквизиты для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| Место, дата и время окончания приема заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник—четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>Последний день приема заявлений — 19.11.2024 г. до 15.00 |

Условия проведения аукциона:
1. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи.
2. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по независимой оценке объекта продажи в размере 249,78 р. с НДС за оценку 1 единицы техники.
3. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по проведению аукциона согласно акту сдачи-выполненных работ от 21.10.2024 № 1 и протоколу несостоявшегося аукциона от 21.10.2024 № 1 в размере 524,51 бел. рубля с НДС.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона — https://grino.by/auktsiony/

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Лидский завод электроизделий».**

Аукцион состоится 12.11.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

| | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-3235 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада запчастей и полуфабрикатов), обшей площадью 1353,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14б;<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-102175 (назначение–сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), обшей площадью 948,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14Ж/18;<br>- газон обыкновенный, площадью 102,5 кв. м, расположенный по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14Б.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000005000213, площадью 3,6915 га (назначение – для строительства и обслуживания производственной площадки № 2), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Толстого, 14Ж/6. Земельный участок является неделимым (расположены иные объекты, не подлежащие продаже). Оформление земельного участка будет осуществляться после реализации имущества. |
| Начальная цена продажи | **ЛОТ № 1** – 354 614,19 р. (триста пятьдесят четыре тысячи шестьсот четырнадцать рублей девятнадцать копеек) с учетом НДС. |
| Сумма задатка | **ЛОТ № 1 –** 35 461 р. (тридцать пять тысяч четыреста шестьдесят один рубль) |
| Реквизиты для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| Место, дата и время окончания приема заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник—четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>Последний день приема заявлений — 06.11.2024 г. до 15.00 |

Условия проведения аукциона: возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи.

Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.09.2024 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/

# ЧЭРЦІ НА ПАТЭЛЬНІ

## Як тэфлон захапіў увесь свет і чым ён небяспечны?



**Сёння ў магазінах прадстаўлены шырокі асартымент посуду, выкананага з розных матэрыялаў. У апошнія гады асаблівай папулярнасцю ў хатніх гаспадынь карыстаюцца патэльні з антыпрыгарным пакрыццём — тэфлонам. Што яно з сябе ўяўляе і наколькі бяспечнае для здароўя? Чаму ў свой час такое пакрыццё выклікала скандал ва ўсім свеце? Пра гэта расказвае нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, член Беларускага саюза журналістаў Гумен ГАРБАННІДЖАД.**



***— Гумен, раскажыце, як з'явіўся тэфлон.***

— Трэба сказаць, што посуд адыгрывае ў нашым жыцці вялікую ролю і здаўна суправаджае чалавека. Калі падчас археалагічных раскопак знаходзяць гліняны посуд, гэта сведчыць пра тое, што там жылі людзі. Раней сапраўды асноўным матэрыялам для вырабу посуду была гліна, якая мела шэраг карысных уласцівасцяў. Напрыклад, у гарачых краінах гліняны посуд, у якім захоўвалі ваду, працаваў як міні-халадзільнік, бо гліна, дзякуючы сваім уласцівасцям, ахалоджвала вадкасць.

Састаў посуду мае вялікае значэнне для нашага здароўя і можа стаць прычынай хвароб. Нават першабытны гліняны посуд мог нашкодзіць, калі ў саставе ўтрымліваліся цяжкія металы, якія падчас гатавання і захоўвання ежы маглі ўступаць з ёй у рэакцыю і траплялі ў арганізм. У той час, вядома, не было лабараторый, каб ацаніць якасць гліны.

Гісторыя развіцця посуду дастаткова доўгая, выкарыстоўваўся і медны, і алюмініевы. Сёння адзін з найбольш зручных — з антыпрыгарным пакрыццём. Ён ёсць амаль на кожнай кухні і падабаецца гаспадыням за тое, што ежа да яго не прыліпае.

Гісторыя антыпрыгарнага пакрыцця пачалася ў 1802 годзе, калі амерыканскі хімік Рэне Дзюпонт адкрыў завод па вытворчасці пораху. У 1861 годзе, калі ў Амерыцы пачалася грамадзянскія войны, ён быў адным з самых паспяховых вытворцаў, а амаль 1,5 мільёна ахвяр загінулі ад патронаў з порахам, выраблен на заводзе Дзюпонта. Сям'я стала адной з самых багатых у Амерыцы. Пазней на заводзе пачалі выпускаць іншыя тавары ваеннага прызначэння, у тым ліку пластыкавыя.

У 1938 годзе адзін з хімікаў, які працаваў на гэтым заводзе, — Рой Планкет, вынайшаў пластык, які мае назву політэтрафторэтылен, больш вядомы як тэфлон. Спачатку ён выкарыстоўваўся ў ваенных мэтах. Бо патрабавалася пакрыццё, якое абараняе ваенную тэхніку ад глебы, якая наліпае, і бруду, што павялічваюць яе знос.

Заяўлялася, што тэфлон абсалютна бясшкодны і не мае таксічных уласцівасцяў. І хутка ён з'явіўся на кухнях. Пачалася рэклама, і продажы тэфлонавага посуду па ўсім свеце білі рэкорды, так што сам завод Дзюпонта быў не ў стане забяспечыць патрэбныя аб'ёмы вытворчасці. Падключылася яшчэ адна знакамітая кампанія — «ЗМ».

Дзякуючы шырокаму выкарыстанню тэфлонавага пакрыцця ва ўсім свеце гэты бізнес стаў шматмільярдным. Ужо ў той час і кампанія Дзюпонта, і «ЗМ» ведалі, што ў саставе тэфлона ёсць ядавітыя рэчывы, якія нясуць шкоду, але працягвалі вытворчасць. Яны, наадварот, падкрэслівалі, што ён бясшкодны, але пры гэтым «ЗМ» інфармавала, што посуд з тэфлонавым пакрыццём нельга выкідваць у смецце, бо ён можа забруджваць навакольнае асяроддзе, і прасілі ўтылізаваць яго асобна.



***— Няўжо не знайшлося лабараторыі, каб устанавіць, што ў саставе тэфлону ўваходзяць шкодныя для чалавека рэчывы?***

— Калі размова ідзе пра мільярдны бізнес, спыніць яго дастаткова складана. І ў той час было шмат хімікаў і экспертаў, прычым не толькі ў ЗША, але і ў іншых краінах, якія заяўлялі, што ў саставе тэфлону канцэрагенныя рэчывы, якія выклікаюць рак. Але вытворцы тэфлону або моцна падаўлялі такія галасы, або куплялі іх грашыма. Такія эксперты — і ёсць «пятая калона», якая ў сваёй краіне шкодзіць суайчыннікам.

Калі ў 1961 годзе дырэктары розных участкаў вытворчасці тэфлону заявілі, што іх рабочыя хварэюць і паміраюць ад розных хранічных хвароб, кіраўніцтва скрывала гэту інфармацыю і сачыла, каб яна нідзе не распаўсюдзілася. І гэта працягвалася больш чым трыццаць гадоў — да 1995-га. У той час фермер у штаце Заходняя Вірджынія побач са сваім участкам, дзе праходзіла рака, убачыў двух памерлых аленяў, ніжэй па цячэнні — дзвюх сваіх памерлых кароў. За год колькасць памерлых кароў дасягнула 153. Ветэрынары, якія іх ускрывалі, бачылі, што ў жывёл пашкоджаны ўсе ўнутраныя органы.

Вышэй па цячэнні, за некалькі кіламетраў ад участка фермера, быў адзін з заводаў Дзюпонта. Звароты на прадпрыемства поспеху не прынеслі. Як і звароты да мэра і ў многія іншыя інстанцыі. У выніку фермер паехаў у іншы штат і звярнуўся да адваката Роберта Білата. Той запрасіў некалькі незалежных хімікаў, яны пабачылі, што ў раку з завода праз трубу паступае зялёная вадкасць, і ўзялі пробы. Адвакат напісаў скаргу на завод. Аднак адвакаты Дзюпонта пастараліся павярнуць справу так, што не завод вінаваты, а прычына ў тым, што фермер няправільна карміў сваіх кароў, і справу закрылі.

**«Дзякуючы шырокаму выкарыстанню тэфлонавага пакрыцця ва ўсім свеце гэты бізнес стаў шматмільярдным. Ужо ў той час і кампанія Дзюпонта, і «ЗМ» ведалі, што ў саставе тэфлона ёсць ядавітыя рэчывы, якія нясуць шкоду, але працягвалі вытворчасць. Яны, наадварот, падкрэслівалі, што ён бясшкодны, але пры гэтым «ЗМ» інфармавала, што посуд з тэфлонавым пакрыццём нельга выкідваць у смецце, бо ён можа забруджваць навакольнае асяроддзе, і прасілі ўтылізаваць яго асобна».**

Тады адвакат накіраваў пробы вады ў EPA (Агенцтва па абароне навакольнага асяроддзя). Дзюпонт у рэшце рэшт вымушаны быў прызнаць віну, што ў кароткі час быў выкід шкодных рэчываў, і фермеру пакрылі страту. Інфармацыя трапіла ў СМІ і выклікала вялікі скандал. Пасля гэтага EPA выпісала штраф вытворчасці Дзюпонта на 16,5 мільёна долараў. Аднак для завода са шматмільярдным даходам гэта была дробязь.

Праўда, справа з дапамогай СМІ набывала ўсё больш абарот, і ў выніку завод спыніў вытворчасць тэфлону. Але паралельна адкрыў іншую, крыху змяніўшы формулу і перайменаваўшы тэфлон у Genex. У рэшце рэшт пасля шырокага абмеркавання ў 2008 годзе продаж тэфлону ў Еўропе быў забаронены, а ў ЗША — у 2013-м.

***— Але посуд з антыпрыгарным пакрыццём ёсць усюды, і мы яго штодзень выкарыстоўваем. Наколькі сёння гэта бяспечна?***

— Тэфлон дагэтуль прадаецца, вакол яго шмат абмеркаванняў, але на дадзены момант лічыцца, што пакуль пакрыццё не пашкоджана, не мае мікратрэшчын, канцэрагенныя рэчывы адтуль не выходзяць. Але калі на патэльні з'яўляецца першая драпіна, карыстацца такім посудам небяспечна. Таму патрэбныя спецыяльныя прыстасаванні для такога пакрыцця — адмысловыя лапаткі і інш. Нават губка для мыцця мае два бакі: жорсткі — для звычайнага посуду, мяккі — для тэфлону.

Такім чынам, калі размова ідзе пра шматмільярдны бізнес, у новым сусветным парадку ні перад чым не спыняюцца, у тым ліку не шкадуюць здароўя людзей. Самае галоўнае, каб эканоміка рухалася наперад, прыносячы прыбытак.

***— Адзін прыклад можна лічыць выпадковасцю...***

— Насамрэч такіх прыкладаў шмат. З 1911 года Уільям Проктэр выраблуў бавоўняны алей для масляных лямп, якія тады шырока выкарыстоўваліся. Пасля распаўсюджання электрычнай лямпачкі бавоўняны алей стаў незапатрабаваны. Яго пачалі выраблаць у цвёрдым выглядзе, і, калі спадар Проктэр убачыў, што яно падобна на сметанковае масла, было прыдумана масла Crisko, больш вядомае ў нас як маргарын. Яго сталі шырока рэкламаваць як альтэрнатыву сметанковаму маслу. Тэмпература таплення маргарыну адрозніваецца ад сметанкавага масла, ён быў зручны для кулінарыі пры вырабе печыва, тортаў, крэмаў.

У 1960 годзе гэты бізнес каштаваў 100 мільярдаў долараў. Аднак урачы пачалі біць трывогу і казалі, што прычынай шматлікіх інфарктаў міякарда, колькасць якіх імкліва павялічвалася, з'яўляецца маргарын. У прыватнасці, транстлушчы, што знаходзяцца ў яго саставе. Аднак кампанія Procter & Gamble ахвяравала 1,5 мільёна долараў на развіццё Асацыяцыі кардыёлагаў ЗША. І яна ператварылася ў нацыянальную арганізацыю. Не дзіўна, што пасля гэтага Нацыянальная асацыяцыя кардыёлагаў заявіла, што маргарын лепшы і больш карысны, чым масла жывёльнага паходжання.

У цяперашні час у такіх краінах, як, напрыклад, Канада, Данія, Швейцарыя, транстлушчы прадаваць забаронена, бо яны нясуць вялікую шкоду сардэчна-сасудзістай сістэме: забруджваюць сасуды, ад чаго людзі атрымліваюць інфаркты міякарда. Штогод ад выкарыстання маргарыну і транстлушчаў гіне 280 тысяч чалавек.

***— Чаму становяцца магчымымі махінацыі ў такім маштабе?***

— На згаданым з тэфлонам прыкладзе мы бачым, як у межах аднаго горада чалавек імкнецца дабіцца сваёй праваты, але нічога не атрымліваецца, і яму трэба звяртацца ў іншы штат і там шукаць адваката. Пры гэтым размова ідзе аб атручванні вялікай колькасці людзей.

Насамрэч уладальнікі шматмільярдных бізнесаў з'яўляюцца стваральнікамі новага сусветнага парадку. І калі свет не будзе шматпалярным, калі адна група людзей ці краіна будзе ўсім кіраваць, такія сітуацыі могуць паўтарацца. У шматпалярным свеце больш шанцаў іх пазбегнуць.

Сучасная эканоміка будуецца на спажыванні. Чым больш мы набываем, тым больш працуе эканоміка, тым больш сродкаў можна зарабіць. Але гэта тупіковы шлях, бо рэсурсы на нашай планеце небясконцыя. Каб пагядзець, як гэта працуе, давайце ўявім, што будзе, калі ў адным умоўным горадзе перасадзіць людзей з машын на веласіпеды. Яны не набываюць аўтамабіль, значыць, не бяруць крэдыты. Акрамя таго, не страхуюць машыны, не набываюць бензін, запчасткі, не плацяць за стаянкі і нават не звяртаюцца да дактароў і ў аптэкі, бо не маюць лішняй вагі. Вось які ўрон можа прынесці эканамічнай сістэме аднаго горада толькі адно дзеянне па адмове ад палітыкі спажывання.

Пры гэтым заўважце, што людзі, якія з'яўляюцца прычынай многіх смерцяў на планеце, ніяк не пакараны. У новым сусветным парадку ўсе міжнародныя судовыя структуры з'яўляюцца рычагом кіравання. Той, хто прыносіць выгаду і шмат грошай, ніколі туды не трапіць. А калі выгады няма, кожнае дзеянне — гэта суд і трыбунал, і вінаватыя будуць знойдзены. Многія называюць гэта двайнымі стандартамі. Насамрэч двайных стандартаў няма, ёсць тое, што камусьці выгадна.

**Алена КРАВЕЦ.**

# СВЯТЛО ДВАЙНОЙ ЗОРКІ

## Вера Пола і Барыс Малкін

**Калі пішаш пра гісторыю Купалаўскага тэатра, якая налічвае цэлы век, увесь час сустракаешся з тэатральнымі дынастыямі, з тымі сувязямі, якія ўзнікалі паміж творчымі людзямі. Так здарылася, калі я пісала пра Уладзіміра Уладамірскага, чыя жонка была актрысай, сын і ўнук таксама сталі акцёрамі. Так было з Лідзіяй Ржэцкай, жонкай калегі па сцэне Льва Рахленкі, з Барысам Платонавым, жанатым з актрысай Ірынай Ждановіч, дачкой заснавальніка тэатра Фларыяна Ждановіча... Сярод дакументаў, што захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, трапіліся мне дзве анкеты — актрысы Веры Пола і тэатральнага мастака Барыса Малкіна. Яшчэ адна пара сужэнцаў, якія звязалі жыццё з беларускім тэатрам. Людзі легендарныя, якіх варта ўспомніць.**





### Спатканне на сцэне

*«Родилась я в 1901 году в Минске, в семье инспектора народных училищ Мемпонова Н. Ф. Мать моя Мемпонова А.Н. — домашняя хозяйка. Училась в минской Мариинской гимназии, гимназию не закончила. В 1922 году поступила в Белорусский драматический театр — ныне Государственный театр имени Янки Купалы».*

Так пачынаецца аўтабіяграфія народнай артысткі БССР Веры Пола.

*«Я, Борис Евсеевич Малкин, родился в 1908 году в городе Прилуках Полтавской губернии. Мой отец — рабочий-наборщик, умер в 1939 году. Моя мать — домашняя хозяйка, в данное время проживает в г. Свердловске. Мой брат — участник Великой Отечественной войны, убит в 1942 году».*

Гэта пачатак аўтабіяграфіі Барыса Малкіна. Былую мінскую гімназістку і сына наборшчыка, маладзейшага на сем гадоў, сутыкнуў Купалаўскі тэатр, куды Барыс Малкін трапіў на работу ў 1937-м. У абаіх за спінай меўся не самы шчаслівы досвед асабістага жыцця. Экзатычнае прозвішча Пола дасталося Веры ад першага мужа, опернага спевака — ён быў па паходжанні, здаецца, часткова іспанец. А Барыс Малкін рана застаўся ўдаўцом, выхоўваў маленькую дачку Лідзію — Вера Пола стала для яе аддана маці.

У архіве захоўваецца дыпломная работа студэнта Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута К. Гусева пад назвай «Щедрые россыпи таланта». Тэма — творчасць народнай артысткі БССР Веры Пола. На першай старонцы — надпіс: *«Дорогая Вера Михайловна! Спасибо за ваш бесценный творческий труд. К. Гусев. 24.06.1967 г.»*. Мяркуючы па ўсім, будучы тэатразнаўца збіраў звесткі непасрэдна ў Веры Пола, таму напісанаму ім варта верыць. Вось што там гаворыцца пра пачатак шляху актрысы на сцэну БДТ-1:

*«Шла репетиция спектакля «Ученик дьявола» («Апостол сатаны») Б. Шоу. Е. А. Мирович что-то объяснял актерам, кого-то распекал... В этот момент в сопровождении директора театра М. Гурского вошла молодая женщина, стройная, с красивым нежным овалом лица и гордой посадкой головы. Ее большие выразительные глаза приковывали внимание. Присутствующие поддались ее очарованию. Была прервана репетиция, что редко случалось по вине посторонних. Режиссер подошел к ней, ласково поздоровался. У гостьи оказался звучный, бархатистый голос. Подумалось, что наконец-то пришла долгожданная героиня, актриса на драматические роли, в которой нуждался театр. Но тотчас же выяснилась ошибка. Гостья оказалась не актрисой, а певицей, зачисленной в хор театра. Это была Вера Николаевна Полло, которая в 1922 году впервые пришла в театр по объявлению о наборе певцов в театральный хор. Вряд ли она тогда серьезно думала о профессии актрисы. Ее желанием было развивать свои вокальные способности. Но, видимо, по-иному решил Е. А. Мирович. Раз увидав ее, он уже не выпускал ее из поля своего зрения».*

У хуткім часе Міровіч прапанаваў Веры Пола ролю ў спектаклі... І пачаўся шлях новай беларускай тэатральнай зоркі. Пола выступала і як спявачка, яна выдатна выконвала беларускія народныя песні. У спектаклі па п'есе Міхася Чарота «На Купалле» была адной з русалак, у спектаклі Міровіча «Машэка» спевы Веры Пола сталі фонам кахання галоўных герояў... Але найяскравей развінуўся талент актрысы ў камедыях. Дасюль глядач успамінае Агату ў «Паўлінцы», з гэтым яе «тудэма-сюдэма»... У артыкуле вядомай тэатразнаўцы Людмілы Саянковай цытуюцца словы Веры Пола: *«Перад спектаклем з народнага жыцця я збірала ў вясковых сваякоў лапці, фартухі, кашулі. Агату і дагэтуль іграю ў кашулі, вытканай маёй бабкай, з аздобай на рукавах. Ад маці вучылася і жывой народнай гаворцы, інтанацыі голасу»*.

### «Лодка, у якой я «памірала», павольна напаўнялася ледзяной вадой»

Былі і ролі ў кіно — іх да крыўднага мала, але ўсе знакавыя: у стужках «Паўлінка», «Несцерка», «Пяюць жаўранкі»... У БДАМЛІМ захоўваецца рукапіс успамінаў Веры Пола пра яе першую ролю ў кінафільме Малчанава «Хвоі гамоняць»:

*«Гэта было ў 1929-м годзе. Тады я была маладой артысткай першага беларускага дзяржаўнага тэатра (цяпер тэатр імя Янкі Купалы). Група таленавітых беларускіх пісьменнікаў-маладнякоўцаў — Міхась Чарот, Міхась Зарэцкі і Анатоль Вольны працавалі над стварэннем сцэнарыяў першых беларускіх кінастужак. Рэжысёр Малчанаў запрасіў мяне на ролю гераіні ў адным з самых першых беларускіх фільмаў «Хвоі гамоняць». У аснову сцэнарыя лягла вядомая тады аповесць Вольнага «Два». Можаце сабе ўявіць, якое хваляванне ахапіла мяне: гэта ж была мая першая роля ў кіно! І такая адказная! Я павінна была іграць вясковую дзяўчыну Алеську, бліжэйшую паплечніцу партызанскага важака, атамана Асы. Ролю якога выконваў вопытны ўжо тады кінаакцёр Капралаў. Нават і цяпер, маючы такі вялікі вопыт работы і ў тэатры, і ў кіно, я б хвалявалася не менш, бо роля партызанкі Алесі, адданай дачкі беларускага народа, вымагала гранічнай шчырасці і праўды пачуццяў ад выканаўцы... Я лічу, што мне дужа пашанцавала: мае першыя крокі ў кіно былі зроблены пад кіраўніцтвам сапраўдных майстроў кінамастацтва. Даволі сказаць, што кінаапаратарам, які здымаў наш фільм, быў вядомы Казлоўскі, Мікалай Феафанавіч Казлоўскі — па сутнасці, заснавальнік апаратарскага майстэрства. Ён яшчэ здымаў некалі першых рускіх кіназорак — Веру Халодную, Максімава, Худалеева, Палонскага... Сярод выканаўцаў фільма беларускіх прафесіянальных акцёраў, апроч мяне, амаль нікога не было. У ролі панны Ямбржыцкай здымалася жонка беларускага паэта Міхася Чарота Аня Кудзелька... Здымалі мы нашу карціну ў маляўнічых мясцінах Беларусі: у Гомелі, у палацы і парку Паскевіча і ў Навабеліцы, дзе былі зроблены ўсе натурныя здымкі. Тут здымаўся цудоўны лес: здавалася, хвоі сапраўды гаманілі з намі.*

*Хоць, калі праўду казаць, здымацца было не заўсёды лёгка. Мая гераіня гінула ад варожай кулі, лежачы ў лодцы. І калі лодка, у якой я «памірала», павольна напаўнялася ледзяной вадой — гэты эпізод здымаўся ў кастрычніку, — можаце ўявіць сабе маё адчуванне...*

*Праўда, пасля мяне напаілі каньяком, расцерлі спіртам, закруцілі ў вялікі дыван. І ў такім выглядзе адправілі дадому...*

*Не ведаю, ці згадзілася б я сёння на такое выпрабаванне...*

*А можа, і згадзілася, хто яго ведае... Не так ужо часта дастаюцца нам, беларускім акцёрам, ролі ў беларускіх фільмах...*

*Выдам адну «таямніцу»: калі ў акцёраў павaліла клубамі пара з роту, працягваць здымкі на радзіме стала немагчыма. І мы знайшлі нашу беларускую рэчку... у ваколіцах Тбілісі»*.

### «Штоб вам заўсёды было, што даваць»

У Барыса Малкіна мелася свая прыказка па жыцці: «Што б вам заўсёды было, што даваць». Дачка Лідзія сведчыць: *«Мои родители всегда совершали гражданские поступки, потому что им было стыдно их не совершать: их спасало всегда чувство гадливости к подлости. Не из чьих рук они никогда не ели, не завидовали деньгам. Они стремились жить интересно, и это было важнее, чем жить хорошо»*.

Барыс Малкін удзельнічае ў дзясятках выстаў, афармляе кнігі, працуе над спектаклямі. Вера Пола заваёўвае любоў гледачоў, атрымлівае званне заслужанай артысткі БССР і ордэн Знак Пашаны...

Пачалася вайна.

Барыс Малкін пайшоў на фронт адразу ж, у першы дзень. Як капітан танкавых войскаў удзельнічаў у баях пад Смаленскам і Масквой. Быў паранены... Пасля чаго вярнуўся да працы мастака. У архіве захоўваецца пасведчанне асобы Малкіна Барыса Яўсеевіча, які знаходзіцца на дзейнай ваеннай службе ў Палітупраўленні Заходняга фронта. Пасада — мастак часопіса «Франтавы гумар». Ёсць у архіве і некалькі ўзораў яго твораў таго часу — майстэрскія малюнкі, з'едлівыя да ворага. У 1943 годзе Барыс Малкін ізноў працуе ў эвакуіраваным родным тэатры, дзе і Вера Пола, якая далучаецца да франтавых брыгад.

Вось водгук ад 18 ліпеня 1943 года за № 241 палітаддзела арміі аб працы брыгады артыстаў Першага беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага сцяга драматычнага тэатра, у складзе якой і Вера Пола. Акцёры далі ў часцях арміі 65 спектакляў і 71 канцэрт.

*«Все спектакли и концерты проходили с большим успехом. Артисты работали с неослабевающей энергией и обеспечивали высокий художественный уровень постановок. Артисты мужественно переносили опасности, связанные с работой бригады в частях переднего края, в непосредственной близости к противнику, а также трудности переездов по фронтовым дорогам»*.

Купалаўскі тэатр працуе ў Томску. Вера Пола ўспамінае: *«Памятаю нараджэнне «Паўлінкі». 1943 год. Сібір. Беларусь змагаецца супраць фашысцкіх акупантаў. Жыццесцвярджальны пафас купалаўскага твора адпавядаў тады нашым запаветным марам. Гэта і спрыяла таму, што атрымаўся яркі, самабытны, усхваляваны спектакль. Пастаноўку яго ў дэкарацыях Барыса Малкіна ажыццявіў выдатны рэжысёр Леў Літвінаў»*.

Самае цяжкае ў тым, што ні Барыс Малкін, ні Вера Пола не ведалі пра лёс дачкі Лідзіі, якая засталася ў Беларусі. Знайшлі яе толькі пасля вызвалення, у вёсцы пад Мінскам.

### «Отец не боялся ничего»

Жыццё нібыта наладжваецца... У 1952 годзе Вера Пола становіцца народнай артысткай БССР. Барыс Малкін — адзін з самых вядомых графікаў рэспублікі. Сакрэт яго манатыпій, асаблівага віду графікі, дагэтуль не разгаданы — мастак карыстаўся лакамі ўласнай вытворчасці. Пасля вайны ён узначальвае аддзел мастацкага афармлення Дзяржаўнага выдавецтва БССР, афармляе часопіс «Чырвоная Беларусь» і шматлікія знакавыя кнігі — «Над ракой Арэсай» Купалы, зборнік Цёткі, паэму Пушкіна «Яўген Анегін». Працягвае афармляць спектаклі. Узначальвае Беларускі мастацкі фонд. Яго працы, між іншым, трывала ўвайшлі і ў наша паўсядзённае жыццё: этыкетка гарэлкі «Крышталь», эмблемы Мінскага трактарнага завода і велазавода, інтэр'ер салона-магазіна «Паўлінка».

Вось урывак з успамінаў Лідзіі Малкінай: *«Отец не боялся ничего. Помню, как в тревожном 1947 году он встретился лицом к лицу с вооруженными бандитами (их было восемь человек), спас меня и какую-то женщину, которую они успели раздеть и собирались изнасиловать. Они зверски избили отца, но он запомнил их лица и, не боясь отмщения и угроз военного командования Белоруссии, боявшегося запятнать честь армии, нашел их в строю»*.

Так, у мірным жыцці не ўсё было гладка. Вучнёўскі сшытак у лінейку ўвесь спісаны няроўным, нервовым почыркам: чарнавік скаргі Веры Пола, датаваны 1955 годам. *«В моей жизни произошли события, которые лишили меня, скажу прямо, здоровья: как вам всем известно, я должна была в Польше играть в двух спектаклях «Жаворонки» и «Ромео»* (гаворка пра ролі ў спектаклях «Пяюць жаўранкі» і «Рамэо і Джульета» — **Л. Р.**). *Перед самой поездкой в Польшу репетировали куски с Ивановым вместо Кравцова и почему-то всегда назначалась С. Так как я всегда была основной исполнительницей кормилицы, я подошла к Г. и спросила, почему это так. Он ответил, что у кормилицы там пара фраз, и сказал меня не беспокоить»*.

Карацей, увесь сшытак — крык душы актрысы, якой не даюць новых роляў, а яе ролі адбіраюць і даюць іншым, а час ідзе, дабаўляецца ўзрост... Кіраўніцтва адмахваецца, высмейвае жаданне актрысы зрабіць пластычную аперацыю... *«Разве физическая молодость актера есть уже лицензия на талант, разве чувства молодого, нового принадлежат только молодым?* — у адчаі пытаецца аўтарка скаргі. — *За 15 лет, поймите, я была занята только в двух* (спектаклях)... *Почему я выброшена за борт, как балласт?.. Я не возражаю, давайте другого плана, это интересно, но не ищите поводов, чтобы лишить актера возможности показать себя, поселить творческую неуверенность, во что бы то ни стало снивелировать по всем статьям...»*

Сумна чытаць такія дакументы... Але сцэнічнае жыццё Веры Пола не перарвалася, з'явілася яшчэ шмат цікавых роляў... А Барыс Малкін стаў ахвярай барацьбы з касмапалітызмам. Переследвалі яго зацята, нават знялі фота з дошкі мастакоў-франтавікоў. Працаваў у стол — але ствараў, ствараў свае цудоўныя манатыпіі... Пра стары Мінск, які на яго малюнках ператвараецца ў казачнае, таямнічае месца, на тэму «Караля Ліра»... З жыцця сышоў у 1972 годзе. Вера Пола перажыла яго на сямнаццаць гадоў.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ПРАСТОРА ДЛЯ НОВЫХ СУСТРЭЧ І ЦІКАВЫХ АДКРЫЦЦЯЎ



**Учора ў сталіцы далі старт XXX Мінскаму міжнароднаму кінафестывалю «Лістапад». На працягу тыдня гасцей і ўдзельнікаў кінафоруму чакае насычаная праграма, дзе яны не толькі ўбачаць найлепшыя гульнявыя, дакументальныя і мультыплікацыйныя фільмы, але і змогуць трапіць на творчыя сустрэчы, майстар-класы і іншыя мерапрыемствы. Сёлета «Лістапад» праходзіць пад дэвізам «Кіно са знакам якасці», а яго галоўнымі тэмамі сталі тэмы 100-годдзя беларускага кіно і 30-годдзя маштабнага кінафоруму.**

Арганізатарамі фестывалю выступаюць Міністэрства культуры, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, Саюз кінематаграфістаў, кінастудыя «Беларусьфільм». У конкурсныя праграмы сёлета трапілі фільмы, адабраныя з 3405 заявак са 124 краін свету. На асноўны конкурс гульнявога кіно вылучана 18 фільмаў, у намінацыі неігравога кіно спаборнічаюць 12 кінастужак, а ў праграме анімацыйнага кіно — 50 кінаработ. У праграме «Кіно маладых» журы разгледзіць сёлета 11 фільмаў, на конкурсе нацыянальных кінашкол пакажуць 15 работ, а вось што датычыцца праграмы нацыянальнага кіно, то там прадстаўлена 23 работы беларускіх кінавытворцаў.

— Я ад імя Міністэрства культуры хачу ўсіх нас павіншаваць з адкрыццём чарговага і юбілейнага XXX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад». Ужо, напэўна, прайшоўшы пэўны падрыхтоўчы этап, сёння хочацца падзякаваць усім, хто ўдзельнічаў у яго арганізацыі і будзе праводзіць фестывальныя мерапрыемствы. Праведзена вялікая работа, — адзначыў **першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый ГРАМАДА.** — Усе мы ведаем, што «Лістапад» пройдзе з 1 да 8 лістапада. У межах фестывалю нас чакаюць конкурсныя і пазаконкурсныя паказы, адбудзецца шмат кінасустрэч і майстар-класаў. Пройдуць Дні кіно Індыі, Ірана, Зімбабвэ, Пакістана, Узбекістана і Расіі (нашага традыцыйна вельмі актыўнага ўдзельніка)...

Усё гэта адбудзецца ў кінатэатрах сталіцы і на шэрагу іншых лакацый. А вось калі казаць аб правядзенні сёлета ўрачыстых цырымоній адкрыцця і закрыцця «Лістапада», то яны праходзяць у Палацы Рэспублікі, як было ў тыя часы, калі фестываль узначальваў акцёр, рэжысёр Расціслаў Янкоўскі.

Ужо не першы год кінафестываль — пляцоўка не толькі для паказу фільмаў, але і для абмеркавання пытанняў, праблем і перспектыў, далейшага развіцця ў сферы кінематографа. Так, сёння, 2 лістапада, у сценах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пройдзе круглы стол, на якім прадстаўнікі кінаіндустрыі з розных краін свету пагавораць пра важныя і актуальныя пытанні гэтай сферы, пра развіццё кіно на постсавецкай прасторы.

— «Лістапад» можна назваць агульнасусветнай платформай для дыялогу, дзе фільмы і людзі з розных краін могуць сустрэцца і размаўляць. Таму мы, як журы, павінны вельмі старанна і дбайна падысці да выбару пераможцаў, — падзяліўся **Лэй ХАНЬ, старшыня журы асноўнага конкурсу ігравога кіно, акцёр, прадзюсар, рэжысёр (Кітай).** — Кінафестываль ужо мае вялікі ўплыў ва ўсім свеце, але, спадзяюся, нашымі агульнымі намаганнямі мы зможам паспрыяць таму, каб яшчэ больш краін далучалася да нас. Таму што, узмацняючы супрацоўніцтва ў сферы кіно, мы таксама ўзмацняем кантакты паміж краінамі...

— Сапраўды, сёлета ў нас міжнародны конкурс, на «Лістападзе» шмат гасцей, якіх мы рады бачыць, і спадзяёмся, што ім спадабаецца ў нас і яны пажадаюць вяртацца. Гэта ўсё было зроблена для таго, каб наш кінафестываль падтрымаў статус міжнароднага, — адзначыла **выканаўчы дырэктар XXX ММКФ «Лістапад» Алеся РУЛЬКОВА.** — Мы будзем рады ўсіх бачыць на кінапаказах, на творчых сустрэчах, якіх у гэтым годзе запланавана шмат. Нашы госці падзеляцца сваімі поспехамі, творчымі дарогамі з нашай моладдзю, для якой мы арганізавалі майстар-класы. Большасць з іх пройдуць у Акадэміі мастацтва і ў сценах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Будзе магчымасць з першых вуснаў пачуць расповед пра ўнікальны вопыт развіцця і стварэння кіно непасрэдна ад яго стваральнікаў.

Пакажуць на сёлетнім «Лістападзе» і залатую калекцыю, у якую ўвайшлі фільмы-пераможцы мінулых фестываляў. Пляцоўкамі кінафоруму стануць і традыцыйныя лакацыі сталічных кінатэатраў: у «Цэнтральным» пакажуць праграму ігравога кіно, у «Піянеры» пройдуць два конкурсы — неігравога кіно і «Лістападзік», у «Беларусі» традыцыйна зможам пабачыць анімацыйнае кіно, а ў «Міры» правядуць адноўлены конкурс нацыянальнага кіно. Цэнтрам кінафестывалю будзе пляцоўка кінатэатра «Перамога», які сёлета адкрыўся пасля рэканструкцыі, і ў рамках юбілейнага «Лістапада» тут пакажуць кіно маладых (старт для тых, хто толькі пачынае) і праграму нацыянальных кінашкол. Дні кінематографа розных краін таксама будуць праходзіць у Вялікай зале гэтага кінатэатра.

— Я даўно не быў на «Лістападзе». І павінен сказаць, што ўражаны праграмай сёлетняга фестывалю і яго маштабам. Таму шчыра віншую ўсіх са стартам. Мяркуючы па праграме, гледачоў чакае вельмі цікавы і насычаны тыдзень, — сказаў **генеральны дырэктар і старшыня праўлення кінаканцэрна «Масфільм» Карэн ШАХНАЗАРАЎ.** — Для мяне Мінск — важны горад, бо, па-першае, некалі я вучыўся ў адным універсітэце і на адным курсе з беларускімі акцёрамі, а па-другое, мой бацька ўдзельнічаў у вызваленні Мінска ў 1944 годзе. Таму бачыць, якой прыгожай стала беларуская сталіца, гэта і ўспаміны пра тату. Думаю, ён быў бы шчаслівы, калі б убачыў ваш горад.

У сваю чаргу **старшыня журы конкурсу для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік» актрыса Святлана СУХАВЕЙ** запрасіла паўдзельнічаць у праглядзе менавіта вышэйназванага конкурсу, адзначыўшы, што «тыя сем кінастужак, якія будзе нагода ўбачыць, вельмі розныя, але ўсе яны закранаюць душу, гавораць пра важныя рэчы».

Падтрымаў гэту думку і **Рым ШАРАФУТДЗІНАЎ, старшыня журы асноўнага конкурсу анімацыйнага кіно, кінарэжысёр, сцэнарыст, аніматар-віртуоз (Расія):**

— У сям'і кіно мультыплікацыя — гэта нібы малодшае дзіця, якое любяць, але не зусім сур'ёзна ўспрымаюць. Але мы забываем пра тое, што жыццё чалавека, яго першыя ўражанні якраз пачынаюцца з мультыплікацыі. І часам нават раней, чым праз кнігі, ён атрымлівае інфармацыю пра навакольны свет праз тыя вобразы, якія мы, мультыплікатары, яму даём. Таму гэта вельмі адказная праца, пра што нам варта помніць. Я чакаю ад анімацыйнай праграмы новых цікавых фільмаў, але хочацца бачыць работы і ў форме традыцыйнай анімацыі. Бо, як паказвае жыццё, напрыклад, анімацыя савецкіх часоў, выпрабаваная дзесяцігоддзямі, і сёння выклікае інтарэс шырокага кола гледачоў.

Таму сачыце за навінамі, праграмай і абавязкова ідзіце на сустрэчу з кінамастацтвам, бо яно заўсёды дае прастору для новых сустрэч, знаёмстваў і адкрыццяў як на вялікім экране, так і за яго межамі.

**Алена ДРАПКО.**

# «ЛІСТАПАД-2024»: АКЦЭНТ НА БЕЛАРУСКІЯ ПРЭМ'ЕРЫ

**На паказах сёлета абяцаюць «кіно са знакам якасці». І вельмі смелае рашэнне ў тым, што на адкрыццё сёлета абралі беларускія прэм'еры. Учора ў Палацы Рэспублікі дэманстравалася новая стужка «Чорны замак», што была знятая па матывах Уладзіміра Караткевіча. А сёння ў кінатэатры «Піянер» на адкрыцці «Лістападзіка» дэманструецца поўнаметражны анімацыйны фільм у фармаце 3D «Песня Сірын» — прэм'еру яго прымеркавалі менавіта да фестывалю.**



Адметная назва, што адразу звяртае да міфалагічнасці, зразумелай мясцовым жыхарам, — яны ж гледачы фестывалю: «Песня Сірын. Крылы славянскіх легенд». Нешта, відаць, блізкае, што мае дачыненне да нас... А тут яшчэ і фармат — вау!.. І рэжысёр Алена Турава, якая паходзіць з сям'і, што мае дачыненне да гісторыі беларускага кінематографа, ды і яна сама — яго адзінка. І айчынная анімацыя — адзін з брэндавых кірункаў беларускага кінематографа. Ну, нібыта ўсё сышлося: трэба глядзець...

Высветлілася, што да рэалізацыі праекта на студыі анімацыйных фільмаў «Беларусьфільма» ішлі доўга: ад задумы да яе рэалізацыі прайшло чатыры гады. Час немалы, зразумела, што каманда стваральнікаў мянялася, перажыла страты значных асоб, што мелі дачыненне да працы над сцэнарыем і яго ажыццяўленнем, бо гісторыя няпростая. І ў гэтым палягае галоўная інтрыга, што стаіць за гэтай прэм'ерай:

— Для нас важна было пазнаёміць гледачоў з найцікавейшым пластом славянскай міфалогіі, пантэонам яе міфалагічных істот і багоў. У адрозненні ад старажытнагрэчаскіх, старажытнарымскіх, егіпецкіх і багоў паўночных скандынаўскіх народаў нашы не так шырока вядомыя, але могуць прыцягнуць увагу. Мне здаецца, гэта магло б быць нашым брэндам, — адзначыла рэжысёр Алена Турава.

І напэўна, беларускаму гледачу, у тым ліку маленькаму, не трэба доўга тлумачыць сэнс свята Купалля. А яно, паводле фільма, можа не адбыцца, бо злая Паляндра (багіня смерці) захапіла Купалу і намагаецца разбурыць баланс, які існуе ў свеце паміж рознымі яго ўзроўнямі, за кожным з якіх — насельнікі з пэўнай зонай адказнасці. Не адбудзецца свята без Купалы — знікне святло, без якога не можа існаваць усё жывое. І нават папараць-кветка не падорыць нікому надзею на цуд — яна ж купальская...

Можна было б стварыць гісторыю, у якой міфічныя істоты разбіраюцца паміж сабой, а мы назіраем за гэтым збоку. Бо Пярун і Вялес, якія калісьці супернічалі за каханне Макошы, цяпер аднолькава зацікаўлены ў пошуку Купалы, як і яго сястра, светлая дзяўчынка Кася-Кастрама. А чароўныя птушкі Гамаюн і Алканост, валодаючы дзіўнымі спевамі, разумеюць, чаму Песня трэцяй іх сястры Сірын такая сумная, — і яны, валодаючы магіяй, даваряюцца рэальным дзеянням тых, хто гатовы кінуць выклік злым сілам. Уявіце сабе, гэта звычайныя хлопчыкі з чалавечага свету, якія ва ўсіх гэтых дзіўных істот не асабліва вераць, — ну нейкія даўнія байкі, альбо героі, вартыя коміксаў. А калі нехта ў нечым моцна сумняваецца, то жыццё яго прымусіць паглыбіцца і зразумець. Ды нават больш — паспрыяць вышэйшай справядлівасці сваім удзелам. Таму што дабро — свядомы выбар кожнага. У любым — фантастычным ці рэальным свеце. Але мяжа паміж імі для двух сучасных хлопчыкаў аказалася незаўважная.

Разбурыць злыя чары прыйдзецца Мацею і Змітру. Адзін з іх захапляецца коміксамі, а другі — арніталогіяй, і, каб знайсці на тэлефон рэдкую дзіўную птушку, гора-блогер і яго сябар трапляюць у дзівосныя прыгоды і вымушаны зразумець, чаму ж птушка Сірын так горка плача.

За час фільма гледачы не толькі сочаць за неверагоднымі прыгодамі, але і знаёмяцца з «зонай адказнасці» кожнага з міфалагічных персанажаў — а гэта магчымасць уцягнуць дзяцей у беларускую культуру і міфалогію, імёны багоў якой мы чуем. Стваральнікі, праўда, падкрэсліваюць — «у славянскую культуру»: анімацыйны фільм, напэўна, пастараецца прасунуць на кінарынкі некаторых блізкіх краін, дзе ён будзе зразумелы, таму што ўсе героі, і нават наш Купала, гавораць па-руску. Як і песні гучаць на рускай мове (Алена Турава ў творчым асяроддзі вядомая яшчэ і як аўтар тэкстаў папулярных песень, тут ёй у гэтым дапамагаў кампазітар Леанід Шырын і папулярныя ў Беларусі артысты). Але ў апавяданне ўплецены традыцыйныя беларускія сімвалы, узоры, малюнкі, якія змяняюць адзін аднаго, нібыта круцяцца ў карагодзе ці калейдаскопе, яны з'яўляюцца своеасаблівымі «лірычнымі адступленнямі». І тут нават дзіця беспамылкова зразумее, што гэта за культура (бо многія з гэтых сімвалаў цяпер навідавоку — ці то ў нейкай прадукцыі кшталту цукерак, ці то ў сувенірах і г. д). Цікава было б паглядзець, як на іх адрэагуюць маленькія гледачы з іншых (нават блізкіх) краін.

Вядома, для нас галоўнае, каб беларускія дзеці лепш зразумелі сутнасць змагання дабра і зла. Што датычыцца апошняга, то Паляндра — вобраз сапраўды жудасны, нават для дарослага (а як адрэагуюць на гэтае «чорнае чарноцце» дзеці?). А Купала — прыгожы хлопчык у кашулі з арнаментам, але мы да пэўнага часу не здагадваемся, што менавіта ён у выглядзе сабакі суправаджаў у падарожжы прасунутых сучасных дзяцей. Ці значыць гэта, што дабро так ці інакш спрыяе тым, хто гатовы быць на яго баку? Разважаць (калі не збегчы ад Паляндры падчас прагляду) будзе пра што. У тым ліку і пра тое, як зроблены гэты фільм, як намаляваныя героі ды ўвасоблены чароўныя сусветы.

Стваральнікі вельмі імкнуліся ўразіць дзівосамі, якія даюць сучасныя тэхналогіі. Цяпер шмат такога ў замежным кіно — ну дык і мы можам. У дадзеным выпадку мы назіраем некалькі ўзроўняў анімацыі: ад коміксаў і класічнай у фармаце 2D да 3D. Кожны з гэтых відаў мае сваё прызначэнне і адказвае за пэўны ўзровень ці культурны пласт. Галоўнае, каб яны не сышлі ў цень за 3D-эфектамі, якія здольныя заваражыць так, што і ў рэальнасці захочацца казкі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «ЗападХимСервис»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20%, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | KB MNP RMN 1500 500 L Кассовый прилавок Мини | 445,20 | 44,52 | 22,26 |
| 2 | KB-A KB MNP RMN 1500 500 L Кассовый прилавок Мини с узким накоп. (7035) метал. метал, в комплекте | 445,20 | 44,52 | 22,26 |
| 3 | KB-A KB MNP RMN 1500 500 L Кассовый прилавок Мини с узким накоп. (7035) метал. метал, в комплекте | 445,20 | 44,52 | 22,26 |
| 4 | KB-A KB MNP RMN 1500 500 P Кассовый прилавок Мини с узким накоп. (7035) метал. метал, в комплекте | 445,20 | 44,52 | 22,26 |
| 5 | KB-A KB MNP RMN 1500 500 P Кассовый прилавок Мини с узким накоп. (7035) метал. метал, в комплекте | 445,20 | 44,52 | 22,26 |
| 6 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок МИНИ 1500 с узким накопителем метал, в комплекте | 319,20 | 31,92 | 15,96 |
| 7 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок МИНИ 1500 с узким накопителем метал, в комплекте | 319,20 | 31,92 | 15,96 |
| 8 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок МИНИ 1500 с узким накопителем метал, в комплекте | 319,20 | 31,92 | 15,96 |
| 9 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок МИНИ 1500 с узким накопителем метал, в комплекте | 319,20 | 31,92 | 15,96 |
| 10 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок МИНИ 1500 с узким накопителем метал, в комплекте | 319,20 | 31,92 | 15,96 |
| 11 | Кондиционер 1U30IS1EAB (S) внешний блок Haier, инв. №5657; Кондиционер AB60CS1ERA (S) внутренний блок Haier, инв. № 5658 | 2 772,00 | 277,20 | 138,60 |
| 12 | Стеллаж 1200*500*1515 | 168,00 | 16,80 | 8,40 |
| 13 | Стеллаж 1200*500*1515 | 168,00 | 16,80 | 8,40 |
| 14 | Стеллаж 1200*500*1515 | 168,00 | 16,80 | 8,40 |
| 15 | Стеллаж 1200*500*1515 | 168,00 | 16,80 | 8,40 |
| 16 | Стеллаж 1200*500*1515 | 168,00 | 16,80 | 8,40 |
| 17 | Стеллаж 1200*500*1515 | 168,00 | 16,80 | 8,40 |
| 18 | Стеллаж винный (795*447*1295) | 126,00 | 12,60 | 6,30 |
| 19 | Стеллаж винный (795*447*1295) | 126,00 | 12,60 | 6,30 |
| 20 | Стеллаж винный (795*447*1295) | 126,00 | 12,60 | 6,30 |
| 21 | Стеллаж винный (795*447*1295) | 126,00 | 12,60 | 6,30 |
| 22 | Стеллаж винный (800*450*1300) | 126,00 | 12,60 | 6,30 |
| 23 | Стеллаж винный (800*450*1300) | 126,00 | 12,60 | 6,30 |
| 24 | Стеллаж островной 1000*400*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 25 | Стеллаж островной 1000*400*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 26 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 27 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 28 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 29 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 30 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 31 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 32 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 33 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 34 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 193,20 | 19,32 | 9,66 |
| 35 | Стеллаж островной 1200*400*1515 | 218,40 | 21,84 | 10,92 |
| 36 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 218,40 | 21,84 | 10,92 |
| 37 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 218,40 | 21,84 | 10,92 |
| 38 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 218,40 | 21,84 | 10,92 |
| 39 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 218,40 | 21,84 | 10,92 |
| 40 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 218,40 | 21,84 | 10,92 |
| 41 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 218,40 | 21,84 | 10,92 |
| 42 | Стол для упаковки 900*900*500 | 65,52 | 6,55 | 3,28 |
| 43 | Стол для упаковки 900*900*500 | 65,52 | 6,55 | 3,28 |
| 44 | Стол для упаковки 900*900*500 | 65,52 | 6,55 | 3,28 |
| 45 | Стол распаковочный 900*500*900 | 65,52 | 6,55 | 3,28 |
| 46 | Стол распаковочный 900*500*900 | 65,52 | 6,55 | 3,28 |
| 47 | Стол распаковочный 900*500*900 | 65,52 | 6,55 | 3,28 |
| 48 | Стол распаковочный 900*500*900 | 65,52 | 6,55 | 3,28 |
| 49 | Стол распаковочный 900*500*900 | 65,52 | 6,55 | 3,28 |
| 50 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425 мм | 562,80 | 56,28 | 28,14 |
| 51 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425 мм | 562,80 | 56,28 | 28,14 |
| 52 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425 мм | 562,80 | 56,28 | 28,14 |
| 53 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425 мм | 562,80 | 56,28 | 28,14 |
| 54 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425 мм | 562,80 | 56,28 | 28,14 |
| 55 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425 мм | 562,80 | 56,28 | 28,14 |
| 56 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425 мм | 562,80 | 56,28 | 28,14 |
| 57 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425 мм | 562,80 | 56,28 | 28,14 |
| 58 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425 мм | 562,80 | 56,28 | 28,14 |
| 59 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425 мм | 562,80 | 56,28 | 28,14 |
| 60 | Шкаф композитный на 48 позиций, размер 605x1135x420 мм, в том числе кронштейн для монтажа оборудования, тип 1 | 520,80 | 52,08 | 26,04 |
| 61 | Шкаф композитный на 49 позиций, размер 545x1310x420 мм, в том числе кронштейн для монтажа оборудования, тип 1 | 520,80 | 52,08 | 26,04 |
| 62 | Шкаф композитный на 49 позиций, размер 545x1310x420 мм, в том числе кронштейн для монтажа оборудования, тип 1 | 520,80 | 52,08 | 26,04 |
| 63 | Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 31685 | 1 260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 64 | Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 31688 | 1 260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 65 | Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 31689 | 1 260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 66 | Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 31690 | 1 260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 67 | Морозильный ларь МЛГ-400 серый, инв. № 32084 | 604,80 | 60,48 | 30,24 |
| 68 | Холодильная витрина SUPER 8 FFD (R290) 7 полок, 7 ценникодержателей, инв. № 32129 | 1 260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 69 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 32222 | 1 260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 70 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 32223 | 1 260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 71 | Холодильная витрина SUPER 8 (R290) FFD белая, инв. № 77848 | 1 260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 72 | Морозильный ларь МЛГ-400 серый, инв. № 78197 | 697,20 | 69,72 | 34,86 |
| 73 | Сканер штрих-кода Metrologic MK7820-00C41, KIT 7820, RS232, 240V, с/н 0D11220171, инв. № 1529 | 327,60 | 32,76 | 16,38 |
| 74 | Сканер штрих-кода Metrologic MK7820-00C41, KIT 7820, RS232, 240V, с/н 0D15101427, инв. № 1530 | 327,60 | 32,76 | 16,38 |
| 75 | Сканер штрих-кода Metrologic MK7820-00C41, KIT 7820, RS232, 240V, с/н 0D13031019, инв. № 1532 | 327,60 | 32,76 | 16,38 |
| 76 | Сканер штрих-кода Metrologic MK7820-00C41, KIT 7820, RS232, 240V, с/н 0D14500736, инв. № 1533 | 327,60 | 32,76 | 16,38 |
| 77 | ASM.63T Сейф | 361,20 | 36,12 | 18,06 |
| 78 | ASM.63T Сейф | 361,20 | 36,12 | 18,06 |
| 79 | ASM.63T Сейф | 361,20 | 36,12 | 18,06 |
| 80 | ASM.63T Сейф | 361,20 | 36,12 | 18,06 |
| 81 | ASM.63T Сейф | 361,20 | 36,12 | 18,06 |
| 82 | LS (LE)-24 Шкаф | 210,00 | 21,00 | 10,50 |
| 83 | LS (LE)-24 Шкаф | 210,00 | 21,00 | 10,50 |
| 84 | LS (LE)-24 Шкаф | 210,00 | 21,00 | 10,50 |
| 85 | LS (LE)-24 Шкаф | 210,00 | 21,00 | 10,50 |
| 86 | LS (LE)-24 Шкаф | 210,00 | 21,00 | 10,50 |
| 87 | LS (LE)-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 210,00 | 21,00 | 10,50 |
| 88 | LS-24 Шкаф для сумок Стандарт | 210,00 | 21,00 | 10,50 |
| 89 | Детектор банкнот PRO 12 grey, с/н 19092759, инв. № 31251 | 35,28 | 3,53 | 1,76 |
| 90 | Детектор банкнот PRO 12 LED, с/н 19080576, инв. № 31253 | 62,16 | 6,22 | 3,11 |
| 91 | Детектор банкнот PRO 12 grey, инв. № 31255 | 35,28 | 3,53 | 1,76 |
| 92 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 93 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 94 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 95 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 96 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 97 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 98 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 99 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 100 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 101 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 102 | Тележка ТГ-150м | 268,80 | 26,88 | 13,44 |
| 103 | Кондиционер Tadiran 36, инв. № 3312 | 436,80 | 43,68 | 21,84 |
| 104 | Кондиционер Tadiran 36, инв. № 3313 | 436,80 | 43,68 | 21,84 |
| 105 | Кондиционер HSU-24HT203R2 внутренний блок Haier, инв. №5768; Кондиционер HSU-24HUN103R2 внешний блок Haier, инв. № 5769 | 2 100,00 | 210,00 | 105,00 |
| 106 | Кондиционер AWI-54HPR1C внутренний блок, инв. №5786; Кондиционер AWO-54HPR1C наружный блок, инв. № M5787 | 512,40 | 51,24 | 25,62 |
| 107 | AWI-50HRDC1E внутренний блок, инв. №29602; AWO-50HRDC1E наружный(внешний) блок, инв. № 29604 | 924,00 | 92,40 | 46,20 |
| 108 | AWI-50HRDC1E внутренний блок, инв. №29603; AWO-50HRDC1E наружный(внешний) блок, инв. № 29605 | 924,00 | 92,40 | 46,20 |
| 109 | Кондиционер GU140W/A1-M наружный блок серия U-Match, инв. №29807; Кондиционер GU140ZD/A1-K внутренний блок напольно-потолочного типа серия U-Match, инв. № 29808 | 3 360,00 | 336,00 | 168,00 |
| 110 | Кондиционер GKH30K3HI внутренний блок кассетного типа с панелью серия U-Match, инв. №31774; Кондиционер GUHN30NK3HO наружный блок серия U-Match, инв. №31776 | 2 268,00 | 226,80 | 113,40 |
